Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 78 (3982)
СУБОТА, 21 САКАВІКА
1931 г.
Цана нумару 5 кап.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

Па-ўдарнаму за сьвінагадоўлю

Учора пачаў сваю работу першы ЎСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЛЁТ УДАРНІКАЎ СЬВІНСАЎГАСАЎ.

Значэньне гэтага факту сапраўды вялізарнае. Зьлёт перадавых байцоў за сацыялістычнае сьвінаводзтва павінен вырашыць ядказныя палітычныя задачы. На парадку дня зьлёту стаяць важнейшыя пытаньні, ажыцьцяўленьне якіх дасьць новыя перамогі на фронце нашай барацьбы за вырашэньне мясной праблемы.

VI Усесаюзны зьезд саветаў яскрава паказаў якіх гігацыкіх посьпехаў дабілася краіна Саветаў у будаўніцтве саўгасаў — гэтых апорных пунктаў рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Яны, гэтыя посьпехі, дасягнуты ў бязьлітаснай барацьбе супроць кулака і яго ідэйных паплечнікаў — правых апартуністаў. Сьледам за шкоднікамі — кандрацьцеўцамі, якія заяўлялі, што саўгасы гэта — «фантастычная зацея», правыя апартуністы не шкадавалі сваіх сіл, каб давесьці «бескарысьнасьць» саўгаснага будаўніцтва. Правыя апартуністы кулаку на выгаду актыўна змагаліся супроць разьвіцьця саўгасаў. Партыя, наперакор карканьню правых, на аснове фарсаванага будаўніцтва буйных саўгасаў і разгортваньня калектывізацыі, у асноўным з посьпехам вырашыла ЗБОЖЖАВУЮ праблему.

Ідучы па гэтым шляху мы з такім-жа посьпехам вырашым І ПРАБЛЕМУ МЯСНУЮ. Створаны па ініцыятыве тав. Сталіна ТРЭСТ «СЬВІНАВОД» пераўтвараецца ў магутную арганізацыю, якая ўжо цяпер здолела разгарнуць сетку ў 350 буйных саўгасаў са стадам у 1.200.000 галоў і зямельнаю плошчай у 20.000.000 гэктараў.

БССР — АДЗІН З АСНОЎНЫХ СЬВІНАВОДЧЫХ ЦЭХАЎ САВЕЦКАГА САЮЗУ. Партыя і ўрад паставілі перад нашымі саўгасамі адказьнейшую задачу, якая павінна быць выканана ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі. 75.000 сьвінаматак павінны мець сьвінаводчыя саўгасы БССР з тым, каб да пачатку 1932 году даць ня менш чым 60.000 таварных сьвіней. УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЛЁТ УДАРНІКАЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ФАБРЫК МЯСА ПАВІНЕН ПРАЙСЬЦІ ПАД ЗНАКАМ БАРАЦЬБЫ НЯ ТОЛЬКІ ЗА ПОЎНАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ГЭТАЕ ЗАДАЧЫ, АЛЕ І ЗА ЯЕ КОЛЬКАСНАЕ І ЯКАСНАЕ ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ.

Ужо за першыя дзесяць месяцаў будаўніцтва сьвінаводчых саўгасаў у БССР на гэтым вучастку дасягнуты бясспрэчна вялізарныя посьпехі. Аднак яны на сёньняшні дзень яшчэ не зьяўляюцца выстарчальнымі. У практыцы будаўніцтва сьвінаводчых саўгасаў ёсьць цэлы РАД СУР'ЁЗНЫХ І НЕДАПУШЧАЛЬНЫХ НЕДАХОПАЎ. Тэмпы ўкамплектаваньня саўгасаў не гарантуюць своечасовага выкананьня вызначаных пляноў. Побач з бальшавіцкімі ўзорамі работы, калі цэлы рад сьвінаводчых саўгасаў на аснове сустрэчных пляноў і сацыялістычнага спаборніцтва ўжо далёка перавысіў праграму ўкамплектаваньня, многія саўгасы ўсё яшчэ ганебна адстаюць. Будаўніцтва сьвінаводчых саўгасаў праходзіць нездавальняюча. МЫ СТАІМ ПЕРАД ТВАРАМ ПРОСТАЙ ПАГРОЗЫ зрыву будаўнічых пляноў.

Падрыхтоўка да другой бальшавіцкай вясны па саўгасах «Сьвінаводу» яшчэ не пераведзена на рэйкі баявых ударных тэмпаў. Тут мы маем яўна незадавальняючае трывожнае становішча.

Першы ўсебеларускі зьлёт ударнікаў сьвінсаўгасаў павінен па-бальшавіцку мабілізаваць усе свае сілы, усю сваю волю і энэргію на самую суровую барацьбу з гэтымі балячкамі і недахопамі. ЗЬЛЁТ ПАВІНЕН АДЫГРАЦЬ РАШАЮЧУЮ РОЛЮ Ў СПРАВЕ КРУТОГА ЎЗДЫМУ ТЭМПАЎ БУДАЎНІЦТВА СЬВІНАВОДЧЫХ ГАСПАДАРАК ДЫ ПАШЫРЭНЬНЯ ІХ КАРМАВОЙ БАЗЫ.

Па-баявому сустрэць ДРУГУЮ БАЛЬШАВІЦКУЮ ВЯСНУ — першая і самая асноўная задача саўгасаў «Сьвінавода». Абавязак кожнага ўдарніка сьвінсаўгасаў забясьпечыць яе выкананьне. Прывесьці ў поўную гатоўнасьць трактарны парк і машыны саўгасаў, стварыць кармавыя фонды, падрыхтаваць пасеўны матар'ял, правільна расставіць людзей, змагацца за кожны лішні гэктар яравых пасеваў, — вось на што перш за ўсё павінна быць накіравана ўвага зьлёту.

Зьлёт павінен дабіцца, каб укамплектаваньне саўгасаў праводзілася сапраўды УДАРНЫМ тэмпам. Ударнік-сьвінавод, калі ён сапраўды ўдарнік, ня можа мірыцца з такім фактам, калі ў яго саўгасе зрываецца будаўніцтва, калі ў яго саўгасе ня выконваецца плян укамплектаваньня, калі яго саўгас ня рыхтуецца да веснавой сяўбы. Рашучая ліквідацыя прарываў у ходзе будаўніцтва і ўкамплектаваньня сьвінаводчых саўгасаў павінна стаць непасрэдным вынікам зьлёту.

Ва ўсю вышыню перад сьвінаводчымі саўгасамі паўстае задача аўладаньня тэхнікай. У гэтай справе ўдарнікі, як і заўсёды, павінны першымі праявіць ініцыятыву, павінны першымі паказаць прыклад.

Трэба аўладаць тэхнікай і эстэхнікай для таго, каб узьняць сьвінаводзтва на яшчэ больш высокую ступень. Трэба памножыць энтузіязм ударнікаў на амэрыканскую тэхніку сьвінаводзтва. Вось куды ўдарнікі сьвінаводчых саўгасаў БССР павінны накіраваць сваю ўвагу, свае сілы.

Трэба прасунуць у сьвінаводчыя саўгасы СПРАВУ РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫІ, ТРЭБА ДАБІЦЦА Ў ІХ САМАЙ ВЫРАЗНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ.

У другую калгасную сяўбу сьвінаводчыя саўгасы павінны стаць арганізатарамі новага прыпіву ў калгасы. Задача ўдарнікаў і ўсіх рабочых сьвінсаўгасаў пад кіраўніцтвам партыйных ячэек змагацца за стварэньне новых сьвінаводчых калгасаў.

Зьлёт ударнікаў павінен забясьпечыць рашучы перапом у падрыхтоўцы «адраў для сьвінаводчых саўгасаў, павінен дабіцца карэннага зруху ў разгортваньні культурнай рэвалюцыі ў саўгасах.

Перадавікі сацыялістычнага сьвінаводзтва ўсе гэтыя задачы, пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый, выканаюць. Яны, як і раней, пойдуць у авангардзе разгорнутай барацьбы за фабрыкі мяса, за вырашэньне ў найнарацейшы тэрмін мясное праблемы.

Новай хваляй сацыялістычнага спаборніцтва, пераходам ад ударных брыгад да ўдарных саўгасаў павінны быць адзначаны практычныя вынікі работы зьлёту. Гэта забясьпечыць новыя посьпехі, новыя перамогі ў будаўніцтве сьвінаводчых саўгасаў.

Зруйнуем супрацўіўленьне кулацтва, якое прабуе затармазіць будаўніцтво саўгасаў, яшчэ больш сурова і жорстка ўдарым па яго агентуры — апартуністах.

Рашуча змагаючыся з апартунізмам, за бальшавіцкія тэмпы работы даб'ем ся новых рашаючых перамог у справе барацьбы за сацыялістычнае сьвінаводзтва.

Дзесяць год новай эканамічнай палітыкі

(1921--1931)

(ГІСТАРЫЧНАЯ СПРАЎКА)

21-га сакавіка 1921 г. ЦВК пастанавіў замяніць харчовую сырцовую разьвёрстку натуральным падаткам, пакінуўшы ўсе запасы харчаваньня сырцу і фуражу, якія застаюцца ў зямлеўладальніку пасьля выкананьня імі падатку, у поўным іх распараджэньні.

Пытаньне аб замене разьвёрсткі харчовым падаткам, а, значыцца, аб пераходзе да новай эканамічнай палітыкі 1921 году ўпяршыню было ўзьнята на пасяджэньні палітбюро ЦК РКП(б) 8-га лютага 1921 г. пры абмеркаваньні дакладу аб «пасеўнай кампаніі і стаборніцтві сялянства».

Для выпрацоўкі пастановы ЦК аб палітычнай становішча сялян да надыходзячага 10-га зьезду партыі была створана камісія, у якой У. І. Ленін прапанаваў наступныя мерапрыемствы:

1) Задаволіць жаданьне беднарыцкага сялянства аб замене разьвёрсткі (у сэнсе забраньня лішкаў) хлебным падаткам.

2) Паменшыць разьмер гэтага падатку ў параўнаньні з разьвёрсткай мінулага году.

3) Ухваліць прыцыпы суадпаведнасьці разьмеру падатку са стараннасьцю зямляроба ў сэнсе зьніжэньня пропанту падатку пры павышэньні стараннасьці зямляроба.

4) Пашырыць свабоду скарыстаньня зямляробам яго лішкаў, вышэй падатку ў мясцовым гаспадарчым абароце пры ўмове шпаркага і поўнага ўнясеньня падатку (дакумант, які заключае ў сабе гэтыя прапановы, азагалаўлен У. І. Леніным «Папярэдні чарнавы набросак тэзісаў наконт сялянства» захоўваецца ў архіве Інстытуту Леніна).

2-га сакавіка 1921 г. пленум ЦК РКП(б) зацьвердзіў пастанову аб замене разьвёрсткі харчпадаткам, васьля чаго канчаткова зрэдагаваная гота пастанова была ўнесена на 10 зьезд РКП(б) у якасьці рэзалюцыі па дакладзе У. І. Леніна аб замене разьвёрсткі харчпадаткам і прынята зьездам 15-га сакавіка 1921 г.

Услед за тым, 21-га сакавіка 1921 году, пастанова аб замене харчразьвёрсткі натуральным падаткам была прынята ЦВК РСФСР. У дэкрэце, прынятым ЦВК РСФСР гаварылася: «Для забесьпячэньня правільнага і супакойнага вядзеньня гаспадаркі на аснове больш свабоднага распараджэньня зямляробамі прадуктамі свайёй працы, сваімі гаспадарчымі сродкамі для ўмацаваньня сялянскай гаспадаркі і ўзьнаўленьня яе прадукцыйнасьці, а таксама ў мэтах дакладнага ўстанаўленьня падаючых на зямляроба дзяржаўных абавязкаў — разьвёрстка, як спосаб дзяржаўнай загатоўкі харчаваньня, сырцу і фуражу замяняецца натуральным падаткам. Усе запасы сырцу, харчаваньня і фуражу, якія застаюцца ў зямляробаў пасьля выкананьня імі падатку, знаходзяцца ў поўным іх распараджэньні». Увядзеньне харчпадатку і ўнясеньне ўсьлед за гэтым раду іншых істотных паправак у эканомпалітыку савецкай улады выклікалі ажыўленьне ўсяго гаспадарчага жыцьця Савецкай Расіі, умацавалі саюз рабочай клясы з асноўнымі масамі сялянства, абумовілі больш шпаркі тэмп адпаўленьня надарванай гадамі імпэрыялістычнай і грамадзянскай вайны народнай гаспадаркі нашай краіны, ня гледзячы на найцяжэйшыя патрасеньні, якія перанесла гаспадарка краіны ў 1921 г. у результаце засухі і голаду. Задачы новай эканамічнай палітыкі У. І. Ленін акрэсьліваў наступнымі словамі: «самкнуцца з сялянскай масай, з радавым сялянствам і пачаць пасоўвацца наперад непамерна, бясконца марудней, чым мы марылі, але зато так, што сапраўды будзе пасоўвацца ўся маса з намі. Тады паскарэньне гэтага руху ў свой час наступіць такое, аб якім мы зараз і марыць ня можам». (Том 18, 2-я частка, стар. 29).

Пераход да новай эканамічнай палітыкі выклікаў надзеі ўсіх клясавых ворагаў на перараджэньне савецкай улады, на паслабленьне, а пасьля і ліквідацыю пралетарскай дыктатуры і рэстаўрацыю капіталізму. Аднак, тэмп надзеям ня суджана было спраўдзіцца. Практычнае гаспадарчае будаўніцтва на шляхох новай эканамічнай палітыкі, пад кіраўніцтвам У. І. Леніна, і пасьля яго сьмерці пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК УсеКП(б) на чале з тав. Сталіным, павочна паказала, што нэп ніколькі ня быў толькі адступленьнем, але што своечасова нэп прадстаўляе сабою палітыку, якая забясьпечвае перагрупоўку клясавых сіл у краіне для падрыхтоўкі наступленьня і, нарэшце, само разгорнутае сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце. Вопыт сацыялістычнага будаўніцтва на рэйках нэпу за мінулыя дзесяць год поўнасьцю пацьвердзіў клясычнае ленінскае акрэсьліваньне сутнасьці нэпу і дапае таварышом Сталіным. «Нэп, — таварыў тав. Сталін,— ёсьць асобная палітыка пралетарскай дзяржавы, разьлічаная на дапушчэньне капіталізму пры пазіўнасьці камандных высот у руках пралетарскай дзяржавы, разьлічаная па барацьбу элементаў капіталістычных і сацыялістычных, разьлічаная на ўзрастаньне ролі сацыялістычных элементаў у страту элементам капіталістычным, разьлічаная на перамогу сацыялістычных элементаў пад капіталістычнымі элементамі, разьлічаная на зьніжэньне клясаў, на чабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі. Хто не разумее гэтай пераходнай дваістай прыроды нэпу, той адыходзіць ад ленінізму». Неразуменьне гэтай дваістай прыроды нэпу было характэрным, як для трацкізму і для так званай «новай апазыцыі» (1925-1927), так і для правааапартуністычнай плыні ў нашай партыі. Трацкісты і «новая апазыцыя», выходзячы з цяверп'я ў здольнасьць рабочай клясы кіраваць сялянствам у барацьбе за сацыялізм, адмаўляючы магчымасьць пабудовы сацыялізму ў адной краіне, разглядалі нэп выключна, як палітыку адступленьня, перадышкі, якая дае магчымасьць толькі «пратрымацца» да перамогі пралетарскай рэвалюцыі ў сьветным маштабе. Разглядаючы нэп толькі як адступленьне, трацкісты і «апазыцыйны блёк» сьцьвярджалі, што ўся гаспадарка СССР, як дзяржаўная прамысловасьць, зьяўляецца толькі асобнай формай дзяржаўнага капіталізму. Толькі як адступленьне расцэньвалі нэп таксама і правыя апартуністы (група Бухарына), якія адстойвалі разьвязваньне рынкавай стыхіі ў неабмежаваны свабодны гандаль, якія змазвалі абвастраньне клясавай барацьбы на новым этапе сацыялістычнага будаўніцтва, якія пранаведвалі «ўрастаньне кулака ў сацыялізм». Ацэнка нэпу, як палітыкі «нармалізацыі таваразвароту, разьвязваньня вытворчых сіл», неразуменьне таго, што нэп зьяўляецца палітыкай, разьлічанай на пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі — абумовілі жорсткае супрацўіўленьне правых апартуністаў супроць разгорнутага сацыялістычнага наступленьня, супроць бальшавіцкіх тэмпаў індустрыялізацыі, шырокага калгаснага і саўгаснага будаўніцтва, супроць ліквідацыі кулацтва як класа. У сваёй барацьбе супроць ленінскага разуменьня нашай партыяй сутнасьці нэпу, правыя апартуністы, як і трацкісты, зьявіліся аб'ектыўным рупарам розных дробна-буржуазных капіталістычных элементаў у нашай краіне. У выніку пасьлядоўнага праведзеньня генэральнага ленінскага пляну будаўніцтва сацыялізму рабочая клясе і прамоўным СССР пад кіраўніцтвам УсеКП(б) дабіліся за мінулы дзесяць год новай эканамічнай палітыкі рашаючых посьпехаў на ўсім фронце ў барацьбе за сацыялізм.

За мінулыя дзесяць год народны даход СССР вырас у чатыры разы; валавая прадукцыя прамысловасьці вырасла ў 12½ разоў; даваенны ўзровень разьвіцьця прамысловасьці, у адносінах да якога прамысловасьць у 1921 г. ледзь дасягнула 20 проц., у бягучым 1931 г. будзе перавышан у тры разы; колькасьць індустрыяльных рабочых за дзесяць год вырасла з 2.430 тыс. да 6.359 тыс. чал.; уся насёўная плошча вырасла за гэтыя дзесяць год у паўтара раза; ужо ў бягучым годзе калгасы ахопяць на менш паловы ўсіх сялянскіх гаспадарак нашай краіны і разам з саўгасамі забясьпечаць абсалютную перавагу сацыялістычных элементаў пад індывідуальным сэктарам у вёсцы; грузазваварот чыгунак за дзесяць год павялічыўся больш, чым у пяцьсот разоў; таваразварот — у 5½ разоў і в д. Тое, што мы ўжо ў бягучым годзе завяршаем пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі нашай краіны, поўнасьцю пацьвярджае правільнасьць ленінскага прагнозу аб тым, што ў пэрыяд нэпу, ў выніку правільнай палітыкі наступіць такое паскарэньне руху, «аб якім мы зараз і марыць ня можам». У сучасны момант СССР уступіў у пэрыяд сацыялізму і адначасова ў апошні пэрыяд нэпу. Завяршэньне сацыяльнай калектывізацыі, ліквідацыя на гэтай аснове кулацтва як клясы і далейшае разьвіцьцё сацыялістычнай прамысловасьці і сельскай гаспадаркі намечанымі тэмпамі вядуць нас да завяршэньня апошняга перыяду нэпу, да поўнай ліквідацыі капіталістычных элементаў у нашай гаспадарцы і да поўнай канчатковай перамогі сацыялізму ў СССР.

Падазроная нэрвознасьць польскай прэсы

Уся буржуазная прэса Польшчы працуе за апошні час асаблівую нэрвознасьць у сувязі з арыштам контр-рэвалюцыйнай групы беларускіх нацыянал-дэмакратаў. У гэтых адносінах выдаляецца віленская прэса, якой на штаце паложана асабліва актыўна займацца «беларускімі пытаньнямі», быць інспіратарам і ініцыятарам антысавецкіх выступленьняў і пільна сачыць за тым, што робіцца ў нас, у БССР.

Арышт контр-рэвалюцыйнай групы беларускіх нацыянал-дэмакратаў выклікае ў віленскай і варшаўскай прэсы бозьнь судовага працэсу над беларускай контр-рэвалюцыяй; аб чым асабліва шмат пішацца на старонках беларускіх газэт. Безпільныя пісакі, за якімі стаіць міністэрства замежных спраў, дэфэнзыва і другі аддзел польскага генштабу, узмоцнена нэрвуюцца пры кожным успамінаньні аб магчымасьці такога працэсу і, відаць, разважаюцца ў сувязі з гэтым патокам агіднага паклёпу, легенд і выдумак.

Мы ня будзем займаць часу нашага чытача абвяржаньнем усяго таго ідыётызму, які штодзенна запаўняе старонкі прэсы «яго вялікасьці» Пілсудскага. Мы хочам тут падкрэсьліць тое цікаўнае з пункту гледжаньня палітычнага, што заключае ў сабе гэта нэрваваньне фашысцкіх газэт з поваду тых удараў, якія нанесла пралетарская дыктатура па беларускай-контр-рэвалюцыі па ўсіх яе відах і формах.

У свой час польская прэса ўзмоцнена здмяжоўвалася, дый зараз здмяжоўваецца ад усіх нясумленных палітычных і арганізацыйных сувязей, якія былі і існавалі паміж беларускімі нацыянал-дэмакратамі і іх гаспадарамі—польскімі імпэрыялістымі. Але, як і заўсёды, гэтыя паны выдаюць сябе з галавой сваімі-ж уласнымі выступленьнямі на тэму аб беларускім нацыяналізьме і адносінах да яго польскага фашызму. Гэтымі дняміі віленскае «Слово», камэнтуючы артыкул, зьмешчаны ў «Зьвязьдзе» аб «Беларускай агентуры інтэрвэнцыяністаў», зьмясьціла пераданы артыкул, прысьвечаны беларускім нацыянал-дэмакратам. У гэтым артыкуле «Слово» піша аб арыштах групы шкодніка ўзяліквідаяржаўных рускіх шавіністаў, прыхільнікаў адзінай непадзельнай Расіі—турмы народаў, якія, да рэчы кажучы, былі ў цесным кантакце з нацдэмамі і далі яшчэ адзін прыклад адзінства контр-рэвалюцыйных сіл розных нацыянальнасьцяй пад эгідай шкодніцтва, падрыхтоўкі інтэрвэнцыі і шпіянажу. Праяўляючы выключную нэрвовасьць у гэтым сваім артыкуле, нэрвовасьць зусім зразумелую, бо раздушана чарговая агентура заграничнага капіталу, «Слово» прабуе адначасова разгарнуць сваю ўласную палітычную праграму, якая кідае яшчэ адзін прамень сьвятла на справу беларускіх нацдэмаў. «Слово» піша:

«Той інтарэс, які мы павінны аддаць гэтаму працэсу (гутарка ідзе аб справе беларускіх нацдэмаў—А.А.) зразумелы з пункту гледжаньня псыхалёгічнага, бо ён датычыць нашых адвечных зямель, з пункту-ж гледжаньня палітычнага прадстаўляе першаступовае значэньне».

Нагадзьці польскай віленшчыны па праўдзе няма канца! Цынічная заява аб «сваіх» землях, калі гутарка ідзе аб БССР, прадстаўляе сабою толькі яшчэ адзін довад усёй хлусьлівасьці і пустаты міралюбівых заяў прадстаўнікоў польскай дыпляматы і адначасова ўсёй агрэсыўнасьці польскага капіталу, які заблытаўся ў сецях свайго ўласнага крызісу і польскіх памешчыкаў. Але гэта чарговая заява органу крэсавых памешчыкаў, якая паяўляецца ў сувязі са справай беларускіх нацыянал-дэмакратаў, пацьвярджае тую агульнасьць мэт і задач, якія ставілі і ставяць перад сабою аб'яднаньня сілы польскай і беларускай контр-рэвалюцыі і па якія ня раз указвала наша прэса. Вядома, адна справа—пляны і імкненьні, іншая справа—іх ажыцьцяўленьне. Што датычыць гэтых імкненьняў і плянаў у беларускіх нацдэмаў, дык факт іх зруйнаваньня органамі пралетарскай дыктатуры пры дапамозе найнырэйшых мас працоўных лепш за ўсё гаворыць куды прывялі брудныя контр-рэвалюцыйныя справы ўсіх гэтых мізэрных лёкаяў акупацыі. Калі-ж гаварыць аб плянах і імкненьнях польскіх імпэрыялістаў, дык мы можам абмежавацца напамінаньнем «лихим моладцам» з Віленскага «Слова» аб вялізарным руху рэвалюцыйных мас Польшчы і Заходняй Белрусі супроць фашысцкай улады, у абарону СССР, супроць вайны, ну, і, калі будзе ўгодна, напамінаньнем аб 1920 годзе і аб фінале кіеўскай авантуры Пілсудзкага. А пасьля 1920 году прайшло, як вядома, 11 год і ў той час, калі імпэрыялістычная Польшча ахоплена найглыбейшым крызісам, калі ва ўмовах гэтага крызісу расьце рэвалюцыйная барацьба польскага пралетарыяту і прыгнечных народаў, у нас, у СССР, ня толькі няма крызісу, але ёсьць магутны пад'ём, ёсьць вялізарнейшы энтузіязм мас, ёсьць агульны рост абароназдольнасьці краіны.

Успамінаючы аб артыкуле «Зьвязды», віленскае «Слово» піша:

«У дзяржаўнай менскай «Зьвязьдзе» мы знаходзім доўгі артыкул пад загалоўкам «Беларуская агентура інтэрвэнтаў», які нясумленна зьяўляецца адлюстраваньнем, да пэўнай ступені, абвінавачвача акту, што рыхтуецца»... —абвінавачвача акту, вядома, на справе беларускай контр-рэвалюцыі.

Не разважаючы шмат па сутнасьці пытаньня аб нібы падрыхтоўваным абвінавачэньні акце, мы толькі падкрэсьлім, што гэта ўвага, якую аддае адтыкуданам «Зьвязды» аб беларускай контр-рэвалюцыі, аб шкодніках, шпіёнах і падрыўніках сацыялістычнага будаўніцтва віленскае «Слово», яшчэ раз пацьвярджае, што гутарка ідзе аб барацьбе супроць сіл, якія жывяцца і жывяцца падтрыманьнем польскага імпэрыялізму і якія свае надзеі ўсупадаюць на інтэрвэнцыю польскага капіталу. Прабуючы зрабіць добрую міну пры нядалай тульне, «Слово» зноў высоўвае ідэю тэй асобнай гістарычнай ролі, якую, моў, павінна адыграць Вільня, якая знаходзіцца пад пятой польскай акупацыі ў процівагу сацыялістычнаму савецкаму Менску.

«Нам ня трэба растлумачваць,—піша «Слово»,—якія вялізарныя кругавіды маглі-б адкрыцца перад намі, калі-б..., вядома, іспавала ў нас самых тая сіла, якая-б вярнула Вільні яе гістарычную ролю, а пакуль хаця-б тая вера, што няма такіх труднасьцяй, якіх нельга было-б перамагчы».

Сэнс гэтай цытаты зноў зусім ясны. Віленскае «Слово» не бяз актыўнай дапамогі з боку беларускіх нацыянал-фашыстаў хацела-б, каб акупаваная Вільня была цэнтрам беларускага нацыяналізму, каб з Вільні польскі імпэрыялізм сваімі шчупальцамі ахопліваў тэрыторыю БССР і каб у бок гэтай Вільні накіраваліся погляды шырокіх мас беларускага народу. Але зноў-такі, адна справа—жаданьне, другая справа —магчымасьці іх ажыцьцяўленьня. Калі акупаваная Вільня, пры дапамозе і пад кіраўніцтвам польскіх імпэрыялістаў можа быць зборышчам контр-рэвалюцыйных нацыянал-фашыстаў, калі пад крылышкам дэфэнзывы могуць там вольна працаваць Луцкевічы, Астроўскія і ім падобныя паны, дык мільёны працоўных Заходняй Беларусі, сымбалем свайго вызваленьня, сьцягам сваёй вызваленчай барацьбы лічылі, лічаць і будуць лічыць сталіцу Беларускай Сацыялістычнай Рэспублікі — чырвоны савецкі Менск. Працоўныя масы Заходняй Беларусі, у тым ліку і гэраічныя пралетары Вільні, якія вядуць сваю барацьбу ва ўмовах жорсткага тэрору, бачаць у БССР, на ўсім Савецкім Саюзе вялікі прыклад тых шляхоў, па якіх трэба ісьці, бачаць, як тут справа сацыялізму праводзіцца ў жыцьцё ўзрастаючай сацыялістычнай прамысловасьцю, сельскай гаспадаркай, якая калектывізуецца, і квітнеючай нацыянальнай пралетарскай культурай.

І тая рашучая барацьба, якую вядзе пралетарская дыктатура БССР, супроць клясавых ворагаў, супроць нацыяналістычнай контр-рэвалюцыі, ня толькі не аслабляе веры ў краіну Саветаў у мільёнаў працоўных Заходняй Беларусі, але яшчэ больш узмацняе адзіны клясавы фронт, яшчэ больш узмацняе міжнародную рэвалюцыйную салідарнасьць. Возьмем хаця-б такі прыклад, як адносіны да палітыкі партыі і савецкай улады БССР асноўнай часткі грамадзянскага кіраўніцтва на чале са сваімі б. паслямі. І т. Тарашкевіч, які зараз сядзіць у турме, і тая частка паслоў, якая прыехала ў БССР, ясна, адкрыта і пэўна салідарызавалася з палітыкай рашучай барацьбы супроць беларускага нацыяналізму, выкрываючы ў сваіх выступленьнях яго контр-рэвалюцыйную інтэрвэнцыяністкую сутнасьць.

Так што, аказваецца, ёсьць у польскіх фашыстаў, такія труднасьці, якіх нельга перамагчы. І атрымліваецца так, як часта ў іх адаралася: хочуць ды ня могуць. Пераможнае будаўніцтва сацыялізму, якое зьнішчае на сваім шляху ўсе перашкоды, труднасьці і ўсіх ворагаў, робіць сваю рэвалюцыйную справу і там, за межамі нашай краіны.

Таму зусім зразумела нэрвовасьць польскіх фашыстаў, калі ў рукі органаў пралетарскай дыктатуры папалі іх агенты. Зразумела таму, што рэвалюцыянізуючы ўплыў пяцігодкі, нацыянальнай палітыкі КП(б)Б і УсеКП(б), прыводзіць у паленьства сілы контр-рэвалюцыі, якая прабуе зрабіць усё, каб перашкодзіць гэтай нашай рабоце.

А. Альшэўскі.

Лекцыя сацыял-інтэрвэнта пад аховай ахранкі і паліцыі

Рыскія рабочыя закідалі меншавіка Дана гнілымі яйкамі

РЫГА, 20. Учора ў народным доме адбылася лекцыя меншавіка Дана, арганізаваная рыскім камітэтам лацьвійскай сацыял-дэмакратычнай партыі. Ужо пры першых словах Дана з радоў слухачоў сталі раздавацца воклічы «інтэрвэнт». У Дана пляцелі гнілыя яйкі і картофля. Калі члены сацыял-дэмакратычных спартыўных арганізацый сталі наводзіць «парадак», адбылася бойка, у часе якой некалькі чалавек было паранена. Сацыял-дэмакратычныя спартсмэны перадэвалі рэвалюцыйным рабочым чыноўнікам охранкі і паліцыі. Было арыштавана каля 20 чалавек.

Антыфашысцкая дэмакстрацыя ў Дусельдорфе

БЭРЛІН, 19. 18-га сакавіка у Дусельдорфе (Рурская вобласьць) адбылася магутная антыфашысцкая дэманстрацыя, у часе якой адбыліся крывавыя сутычкі паміж рабочымі і паліцыяй. Паліцыя пусьціла ў ход агнястрэльную зброю, адзін рабочы забіты, адзін сьмяротна паранены, а некалькі рабочых і работніц паранена лёгка.

Крывавая сутычка рабочых з паліцыяй

БЭРЛІН, 18. У горадзе Науэне пад Бэрлінам адбылася ўчора антыфашысцкая дэманстрацыя, у часе якой адбылася крывавая сутычка паміж паліцыяй і рэвалюцыйнымі рабочымі. Паліцыя прабавала разагнаць дэманстрантаў і пусьціла ў ход агнястрэльную зброю. Трэ рабочых, а таксама некалькі паліцэйскіх цяжка паранены.

Аб новым генэральным пляне электрыфікацыі СССР

Гутарка з тав. Куйбышавым

У гутарцы з супрацоўнікам «Правды» старшыня Дзяржпляну СССР тав. Куйбышаў павядаміў наступнае: нядаўна мы сьвяткавалі 10-гадовы юбілей пляну ГОЭЛРО. Нашы посьпехі ў справе электрыфікацыі СССР усім вядомы. Плян ГОЭЛРО сабе цалкам апраўдаў і ў значнай частцы ўжо выкананы. У найпрашчі час перад намі стаіць задача стварэньня новага генэральнага пляну электрыфікацыі СССР — гэтай асновы нашага народна - гаспадарчага пляну. Патрэбнасьць стварэньня генэральнага пляну электрыфікацыі выклікаецца радам мерканьняў:

1) Агульныя разьмеры разгортваньня прамысловага вытворства, у прыватнасьці здабыча вугалю, нафты, выплаўка медзі і г. д. Намячаньні ГОЭЛРО ўжо даўно выкананы. Перад намі стаіць цяпер новыя заданьні па разгортваньні нашых асноўных галін прамысловасьці ў тэмпах, якія яшчэ не маглі быць прадбачаны 10 год назад. Таму неабходна выпрацаваць пляны вядавальненьня гігацкі ўзрастаючай патрэбнасьці электраэнэргіі.

2) У сэнсе тэхнікі электрыфікацыя за мінулы пэрыяд перапрацавала істотныя зьмены, падвяргаючыся цэламу раду навейшых тэхнічных дасягненьняў, асабліва ў галіне перадачы току высокіх напружаньняў, у павялічэньні магутнасьці асобных агрэгатаў і г. д. Гэта прымусіла нас па-новаму падыйсьці да справы электрыфікацыі СССР, чым можна было падыходзіць да гэтай справы 10 год назад. Неабходна ў самым бліжэйшым будучым прыступіць да складаньня генэральнага пляну будаўніцтва сацыялізму ў СССР.

Лішне ўказваць, што задача прапрацоўкі генэральнага пляну электрыфікацыі СССР вельмі цяжкая і адказная. Для спэцыяльнай падрыхтоўкі да гэтай работы ў красавіку прэзыдыумам Дзяржпляну пастаноўлена склікаць шырокую нараду па пытаньнях электрыфікацыі СССР у складзе прадстаўнікоў буйнейшых спажыўцоў электраэнэргіі, буйнейшых спэцыялістаў па электрыфікацыі, прадстаўнікоў электрыфікуючых арганізацый і Электрацэнтру, а таксама ВСНГ і раду іншых. На нарадзе маркуецца заслухаць даклады па розных пытаньнях, зьвязаных з электрыфікацыяй СССР.

Для арганізацыі нарады створан камітэт у складзе т. т. Ломава, Кржыжаноўскага, праф. Аляксандрава, акад. Іоффэ, праф. Катэлема і праф. Курдзіна, прадстаўнікоў Энэргацэнтру і г. д.

НЕАПУБЛІКАВАНЫЯ ДАКУМАНТЫ ЛЕНІНА

Ліст У. І. Леніна аб рабоце дзяржтрэстаў на гаспадарчым разьліку

Ніжэй публікуемы дакумант прадыктован Леніным па тэлефону з Горак 1-га лютага 1922 году. Ліст напісан у сувязі з фінансавым крызісам, які выклікан вялізарным ростам эмісіі на працягу асеньніх месяцаў 1921 году. Гэты крызіс адбіўся на дзейнасьці дзяржаўных трэстаў, якія не змаглі перабудаваць сваю работу на пачатках гаспадарчага разьліку, і выявіўся ў спыненьні плацяжоў радам гаспадарчых органаў. Пытаньне аб фінансавым крызісе асьветлена на 11-м зьезьдзе партыі ў спэцыяльным дакладзе (гл. 11-ы зьезд РКП(б). Стэнаграфічная справаздача (стар. 275-276; 295-298).

Дакумант апублікоўваецца ўпяршыню па тэксьце, надрукаваным на машынцы на бляшку старшыні Савету Народных Камісараў.

Інстытут Леніна.

1-га лютага 1922 году.

Таварышу Сакольнікаву.

(Копія тав. Цюрупе і тав. Кржыжаноўскаму).

Вы мне сказалі, што некаторыя нашы трэсты могуць у бліжэйшай будучыні аказацца бяз грошай і прасіць нас ультыматыўна аб тым, каб мы іх нацыяналізавалі. Я думаю, што трэсты і прадпрыемствы на гаспадарчым разьліку аснаваны іменна для таго, каб яны самі адказвалі, і пры тым, цалкам адказвалі за бязупынасьць сваіх прадпрыемстваў. Калі гэта, аказваецца, імі не дасягнута, дык па-мойму, яны павінны быць прыцягнуты да суда і караюцца ў складзе ўсіх членаў праўленьня доўгім пазбаўленьнем волі (можа быць з ужыцьцём пасьля вядомага тэрміну умоўнага аслабаненьня), канфіскацыі ўсёй маемасьці і г. д. Калі мы, стварыўшы трэсты і прадпрыемствы на гаспадарчым разьліку, ня зможам дзелавым купецкім спосабам забясьпечыць поўнасьцю свае інтарэсы, дык мы апажамся кругамі дурнямі. Сачыць за гэтым павінен ВСНГ, але яшчэ больш Наркамфін—праз Дзяржбанк і праз спэцыяльных інспэктароў, бо іменна Наркамфін, ня будучы зацікаўленым непасрэдна, абавязан устанавіць сапраўдны рэальны кантроль і праверку.

ЛЕНІН.

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б

аб арганізацыі інстытуту масавага завочнага навучаньня пры ЦК КП(б)Б

Сакратарыят ЦК КП(б)Б па пытаньні аб арганізацыі інстытуту масавага завочнага навуча

УЗЬНЯЦЬ КРЫВУЮ

ВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНАЎ УСЕАГУЛЬНАГА НАВУЧАНЬНЯ І ЛІКВІДАЦЫІ НЯПІСЬМЕННАСЬЦІ

Праз манэўры забясьпечыць ударны разгон у ажыцьцяўленьні маршрутаў другога этапу культэстафэты

Дзень старту сканцэнтраваць мабілізацыйны энэргіі шырокіх мас працоўных для барацьбы за якасьць усеагульнага навучаньня, за політэхнізацыю школы, за апалоданьне тэхнікай, за суцэльную пісьменнасьць савецкай краіны

Да старту прыйсьці падрыхтаванымі

«Дэкада штурму» ідарываў на фронце ліквідацыі няпісьменнасьці і ўсеагульнага навучаньня дала значныя вынікі ў справе выкананьня плянаў гэтых базавых задач. Шмат якія раёны праз добрае правядзеньне дэкады значна ўзьнялі работу па ліквідацыі няпісьменнасьці і ўсеагульнага, давялі выкананьне плянаў гэтай работы да параўнаўча-высокага процанту.

Гэтыя посьпехі радам раёнаў дасягнуты дзякуючы ўменьню ПРАВІЛЬНАЙ арганізацыі работы, дзякуючы таму, што партыйныя і савецкія арганізацыі гэтых раёнаў змаглі прыцягнуць усю грамадзянскасьць да практычнага ўдзелу ў выкананьні пастаўленых дэкадай задач.

Побач з тым, што дасягнутыя посьпехі радам раёнаў замацоўваюцца, што работа ўзьнімаецца на вышэйшую ступень—шмат дае посьпехі дэкады «ночнім на дварах».

«Маўр зрабіў сваё справу, маўр можа пайсьці». Кіруючыся гэтым дэвізам, апартуністы ў асобных раёнах прыняті да яўнага паспаволеньня работу па ліквідацыі няпісьменнасьці і ўсеагульнага навучаньня пасьля дэкады штурму.

Толькі з прычыны панаваньня ў радзе раёнаў стаўні на самацёк і настроеў апартуністычнага «благапалучча» мы стаім перад фактам ЗНІЖЭНЬНЯ ЗА АПОШНЮЮ ДЭКАДУ АХОПУ УСЕАГУЛЬНЫМ НАВУЧАНЬНЕМ ДЗЯЦЕЙ 8-10-ЦІГАДОВАГА ВУРОСТУ НА 0,5%. У колькасных адносінах гэта складае ня 1.000 чал. толькі па 36 раёнах. Апартуністычная недаацэнка ліквідацыі няпісьменнасьці прывяла да таго, што па БАРЫСАЎСКІМ, ГЛУСКІМ І ЧАРЭЙСКІМ раёнах гэта работа ФАКТЫЧНА ПРАВАЛЕНА, па Жлобінскім, Буда-Кашалёўскім, Юравіцкім і цэлым радзе іншых раёнаў — пастаўлена пад непасрэдную пагрозу зрыву.

Камсамольскія арганізацыі на мясцох усё яшчэ НЕ ЎЗЯЛІ ПАТРЭБНЫХ ТЭМПАЎ па выкананьні абавязкаў шэфа ўсенавучаньня.

Толькі ў пасобных мясцох ёсьць узоры бальшавіцкай работы з боку камітэтаў і ячэек ЛКСМБ.

Агульнае становішча з выкананьнем плянаў усеагульнага навучаньня і да сёньняшняга дня НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧАЕ. Асьлівы ЦЯЖКІМ — СЫГНАЛІЗУЮЧЫМ АБ ТРЫВОЗЕ — ТРЭБА ПРЫЗНАЦЬ СТАНОВІШЧА ЛІКВІДАЦЫІ НЯПІСЬМЕННАСЬЦІ. Тэмпы, якімі зараз разгортваецца гэта работа, ня эмогуць забясьпечыць поўнага і своечасовага выкананьня пастаноў партыі і ўраду.

Невыкананьне плянаў усеагульнага навучаньня і ліквідацыі няпісьменнасьці наўхільна адмоўна адаб'ецца на стварэньні рэальнай базы для пасьпяховага разгортваньня падрыхтоўкі кадраў.

ТРЭБА НАМАГЧЫ ЎСЕ СІЛЫ, ЎЖЫЦЬ УСЕ МЕРЫ ДА ТАГО, КАБ КРЫВУЮ ВЫКАНАНЬНЯ ГЭТЫХ ПАЛІТЫЧНА ВАЖНЫХ ЗАДАЧ КРУТА ЎЗЬНЯЦЬ УВЕРХ.

Пастанову штабу аб правядзеньні культманэўраў трэба ператварыць у практыку баявой падрыхтоўкі да старту другога этапу культэстафэты.

Атрады культармейцаў, групы «лёгкай кавалерыі» павінны быць прыведзены ў баявую гатоўнасьць. Трэба заразжа арганізаваць цэлы рад напітаў на культасьветныя ўстановы — хаты-чытальні, школы, ліквпункты, гаспадарчыя, прафсыяніальныя арганізацыі з мэтай праверкі становішча работы па падрыхтоўцы да другога этапу культэстафэты.

Патрэбна неадкладна АДНАВІЦЬ РАБОТУ РАЁННЫХ ШТАБАЎ, ТРОЕК, прыцягнуць НАЙБОЛЬШУЮ КОЛЬКАСЬЦЬ ПРАЦОЎНЫХ і ў першую чаргу КАМСАМОЛЬЦАЎ І АСЬВЕТНІКАЎ у рады культармейцаў.

САМАЕ ВАЖНАЕ ЗАКЛЮЧАЕЦЦА Ў ТЫМ, КАБ ПРАВІЛЬНА РАССТАВІЦЬ СІЛЫ. Іменна выходзячы з гэтага меркаваньня, трэба атрады культармейцаў будаваць па-маршрутна. Кожнаму культармейцу трэба даць ПЭЎНАЕ ЗАДАНЬНЕ, ДАКЛАДНА ВЫЗНАЧЫЦЬ яго месца.

Добрае правядзеньне манэўраў і культэстафэты другога этапу будзе забясьпечана толькі пры ўмове самай баявой работы партыйных, камсамольскіх арганізацый савецкіх установ, пры ўмове самага дружнага адпору апартуністычнай недаацэнцы справы ліквідацыі няпісьменнасьці і ўсеагульнага навучаньня.

Другі этап культэстафэты

На пасяджэньні цэнтральнага штабу ад 13-га кастрычніка зацьверджаны маршруты, па якіх будзе праходзіць другі этап усебеларускай культэстафэты.

Асноўнай задачай правядзеньня культэстафэты зьяўляецца **падпарадкаваньне ўсёй культпалітасьветнай работы задачам выкананьня прамфінпляну і бальшавіцкай падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.** Культэстафэта будзе праходзіць па маршрутах: за 100-процантнае выкананьне плану па ліквідацыі няпісьменнасьці, за лепшую якасьць усеагульнага навучаньня, за політэхнізацыю школы, за аўладаньне тэхнікай, за масавае разгортваньне дашкольнага выхаваньня, за ўдарныя тэмпы падрыхтоўкі пралетарскіх кадраў.

Штаб па правядзеньні другога этапу культэстафэты прапанаваў усім райвыканкомам і гарсаветам склаць раённыя штабы культэстафэты, а дзе яны існуюць, аднавіць іх работу. Пры сельсаветах і на прадпрыемствах утварыць тройкі і пяцёркі. Кіруючыя органы культэстафэты (штабы, тройкі) арганізуюцца ў складзе прадстаўнікоў ад органаў народнай асьветы, партыйных, камсамольскіх, прафсыяніальных, кааперацыйных арганізацый, а таксама рабочых бацракоў і калгасьнікаў—культармейцаў.

Да пачатку культэстафэты ў парадку падрыхтоўчай работы будуць праводзіцца культманэўры.

У гэты пэрыяд патрэбна арганізаваць **масавыя налёты** на ўсе школы, ліквпункты, шкавучальныя культасьветныя ўстановы, а таксама адзіночныя гаспадарчыя, кааперацыйныя арганізацыі, з мэтай выцьленьня ступені падрыхтаванасьці да старту культэстафэты.

Налёты павінны быць праведзены сіламі груп «лёгкай кавалерыі» і культармейцаў.

З мэтай папулярызацыі задач культэстафэты неабходна правесьці масавыя сходы рабочых на ўсіх прадпрыемствах, саўгасах. Сходы калгасьнікаў і аднаасобнікаў—беднякоў і сераднякоў у вёсках, па якіх дакладна растлумачыць значэньне і рух маршрутаў культэстафэты.

Неабходна правесьці ўлік культармейцаў, разгарнуць вярбоўку новых, арганізуючы намаршрутныя атрады.

Раённыя штабы, сельскія тройкі павінны безадкладна распрацаваць пляны - маршруты культэстафэты, выходзячы з канкрэтных умоў і становішча работы ў гэтай галіне па раёне.

Правільная расстаноўка сіл, дакладная арганізацыя работы зьяўляюцца зарукай пасьпяховага выкананьня пастаўленых культэстафэтай задач.

Раённыя арганізацыі павінны як можна лепш правесьці культманэўры з тым, каб прыйсьці падрыхтаванымі да пачатку культэстафэты.

Старт культэстафэты будзе дан у пэрыяд з 1 па 5 красавіка. Пачынаючы з гарадоў і канчаючы прадпрыемствам, калгасам, вёскай, старт павінен быць адзначан правядзеньнем масавых урачыстых вечароў з удзелам культармейцаў і ўсёй пралетарскай грамадзянасьці. Патрэбна арганізаваць у гэты дзень дэманстрацыі, мітынгі з тым, каб найшырэй прыцягнуць усю савецкую грамадзянасьць да барацьбы **за поўнае выкананьне плянаў** усеагульнага навучаньня і ліквідацыі няпісьменнасьці **за культурную рэалізацыю.**

Няма бальшавіцкага падыходу

Праведзеная «дэкада штурму» ў справе ліквідацыі няпісьменнасьці і ўсеагульнага навучаньня па Жлобінскім раёне патрэбных вынікаў не дала. Буйнейшыя прарывы ў гэтай галіне і па сёньняшні дзень не ліквідаваны. Такое становішча стварыла яўную пагрозу зрыву плянаў на гэтым важнейшым вучастку культурнага будаўніцтва. Партыйныя, савецкія, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі раёну ня здолелі як сьлед мабілізаваць усю савецкую грамадзянасьць на ажыцьцяўленьне задач па ліквідацыі няпісьменнасьці і ўсеагульнага навучаньня. У пасобных сельсаветах і арганізацыях «дэкаду штурму» проста прапалі. Так, у часе правядзеньня дэкады нічога ня было зроблена на Жлобінскім чыгуначным вузле. Між тым, шмат няпісьменных і малапісьменных рабочых і па сёньняшні дзень не ахоплена школамі і ліквпунктамі. Па радзе мясцовых камітэтаў нават няма патрэбнага ўліку няпісьменных і малапісьменных.

Агульнае становішча ў раёне па ліквідацыі няпісьменнасьці і ўвядзеньня ўсеагульнага навучаньня дае поўную падставу зрабіць вывад, што мясцовыя арганізацыі не падышлі па-бальшавіцку да выраішэньня гэтых палітычна важных задач.

Машніцкі.

Правалілі важнейшую справу

(Чарэйскі раён)

У студзені мясяцы ЦК КП(б)Б і СНК дадзі тэлеграму ўсім РК КП(б)Б і РВК аб баявым правядзеньні «дэкады штурму» па ліквідацыі прарываў. У сакавіку ЦК і СНК аноў катэгарычна прапанавалі ўсім раёнам дабіцца выкананьня дырэктыў партыі і ўраду ў справе ўсеагульнага навучаньня і ліквідацыі няпісьменнасьці.

З гэтых важнейшых і катэгарычных дырэктыў партыі і ўраду Чарэйскі РК КП(б)Б і РВК не зрабілі патрэбных вываўваў. Вось некалькі прыкладаў.

Замест арганізацыі работы школ малапісьменных і ліквпунктаў з 1-га кастрычніка гэту работу ў Чарэі пачалі толькі ў сьнежні месяцы. Паводле першых вестак, завербаваны ў ліквпункты, школы, ня ўлічваючы адсеву (які ў сярэднім даходзіць да 30-35 проц.), толькі 62 проц. вродна вызначаных плянам. Але гэта яшчэ ня ўсё.

У Чарэі спачатку не прадугледзелі, а потым не заўважылі «маленькай дробнай справы», якая зводзіцца да забясьпячэньня ліквпунктаў і школ прыладамі і, у прыватнасьці, газай.

Не прапрацаваўшы нават аднаго тыдня, школы і ліквпункты з гэтай прычыны спынілі работу. 3.923 чал. вымушаны былі спыніць сваю вучобу. І гэта працягвалася 2 з пал. месяцы.

Мы падкрэсьліваем, што тут справа ня у нашых часовых труднасьцях, не ў так званых аб'ектыўных умовах. Справа выключна ў суб'ектах—у канкрэтных винаватых зрыву важнейшага мерапрыемства. Гэта тым больш выразна відаць, калі мець на ўвазе, што ў суседніх раёнах (Крупскім, Чэрвіцкім і інш.) усімі патрэбнымі прыладамі, у тым ліку і газай школы і ліквпункты былі забясьпечаны ў выстарчальнай колькасьці.

Аб палітычнай недаацэнцы справы, апартуністычных адносінах да ліквідацыі няпісьменнасьці і ўсеагульнага навучаньня сьведчыць і той факт, што ні прэзыдыум РВК, ні райком КП(б)Б, ні райпрафсавет ўсім пічога не зрабілі для таго, каб папярэдзіць зрыў гэтай работы. За ўвесь навучальны год ні адна з названых установ і арганізацый не разглядалі гэтага пытаньня на сваіх пасяджэньнях.

Усё гэта з найвялікшай выразнасьцю гаворыць аб апартуністычнай практыцы, стаўцы на самацёк у работе чашніцкіх партыйных, савецкіх арганізацый у гэтых важнейшых пытаньнях культурнага будаўніцтва.

Выходзячы з такога становішча, калегія НКАсьветы перадала гэту справу пракурору для прыцягненьня винаватых у зрыве работы да судовай адказнасьці. Апартуністы з партыйнага кіраўніцтва, якія на сутнасьці натуралі такому становішчу, павінны быць таксама прыцягнуты да суровай партыйнай адказнасьці.

Са становішча зрыву работы па ліквідацыі няпісьменнасьці ў Чарэйскім раёне трэба зрабіць належныя вывады, якія папярэдзілі-б іншыя раённыя арганізацыі ад зрыву гэтай важнай справы.

С-к.

Да суровай адказнасьці за зрыў ліквідацыі няпісьменнасьці

(З пастановы калегіі Наркамасьветы)

Заслухаўшы даклад аб ходзе ліквідацыі няпісьменнасьці па Барысаўскім Глускім, Юравіцкім, Буда-Кашалёўскім, Жлобінскім, Віцебскім, Старобінскім, Асьвейскім і Бягомльскім раёнах, калегія Наркамасьветы канстатуе, што ў выніку праваапартуністычных адносін і палітычнай недаацэнкі з боку раённых кіруючых савецкіх, прафесыяніальных, камсамольскіх, кааперацыйных установ і арганізацый, і ў першую чаргу органаў народнае асьветы,—ліквідацыя няпісьменнасьці—гэта баявая задача партыі—фактычна правалена па Барысаўскім і Глускім раёнах, пастаўлена пад непасрэдную пагрозу зрыву ў Жлобінскім, Буда-Кашалёўскім і Юравіцкім раёнах і выкопваецца яўна нездавальняючэ па ліквідацыі раёнах, за выключэньнем Бягомльскага, дзе справа па ліквідацыі няпісьменнасьці праходзіць больш-менш арганізавана.

Выходзячы з гэтага, калегія НКА пастанаўляе:

Інспэктара політасьветы па Барысаўскім раёне т. Ільковіча і Глускім раёне т. Баўчка за зрыў дырэктыў партыі і ўраду па ліквідацыі няпісьменнасьці—з працы зьняць.

Інспэктару політасьветы па Юравіцкім раёне т. Сарокінай, Жлобінскім раёне—т. Аперу, Буда-Кашалёўскім раёне т. Матусевічу за бездарэмныя і надбайныя адносіны да выкананьня задач па ліквідацыі няпісьменнасьці абвясьціць суровую вымову і папярэдзіць, што калі імі ня будзе забясьпечан стопроцантны ахоп ліквпунктамі няпісьменных да 25-га сакавіка—будуць прыняты больш рашучыя захады.

Паказаць інспэктару політасьветы г. Віцебску т. Лагому, інспэктару політасьветы Старобінскага раёну т. Уранавічу і Асьвейскага раёну—т. Лукомскаму на неабходнасьць больш энэргічнай работы па забясьпячэньні стопроцантнага выкананьня плану па ліквідацыі няпісьменнасьці.

Прасіць ЦСПСБ, ЦК ЛКСМБ і СНК прыняць меры да старшынь райпрафсаветаў, сакратароў РК КСМ і старшынь раённакомаў Барысаўскага, Глускага, Юравіцкага, Буда-Кашалёўскага і Жлобінскага раёнаў за недапушчэньне спаўнай работу па ліквідацыі няпісьменнасьці.

НКА папярэджвае, што за зрыў ліквідацыі няпісьменнасьці вінаватыя будуць прыцягвацца да строгай адказнасьці.

НКА будзе разглядаць працаздольнасьць інспэктуры політасьветы па ступені выкананьня гэтай дырэктывы.

Ад усеагульнага навучаньня адмахваюцца

У Добрушы на фронце ліквідацыі няпісьменнасьці і ўсеагульнага навучаньня маецца шмат недахопаў.

Хоць усеагульным навучаньнем ахоплены амаль усе дзеці 8-гадовага ўзросту, аднак маецца рад выпадкаў, калі дзеці бяз усякіх на гэта прычын у школу не насылаюцца. Ні гарсавет, ні фабком ніякіх мер у гэтых адносінах ня прымаюць.

У школах першай ступені маецца значны адсеў з-за адсутнасьці абутку. Для гэтага ўзросту ні аднай пары абутку да апошняга часу не атрымана. Між тым кааперацыя не праявіла ніякай ініцыятывы для забясьпячэньня абуткам дзяцей гэтай катэгорыі. Гарачых сьнеданьняў няма ні ў адной школе гораду.

З політэхнізацыяй справа стаіць таксама дрэнна. Ні ў адной са школ першай ступені няма рабочага пакою. У школе ФЗС маецца сталярная і сьлясарная майстэрня, вучні сёмай групы праходзяць вытворчую практыку на фабрыцы. Здавалася-б, што ўсё у парадку, аднак на справе атрымлівецца інакш. Адміністрацыя фабрыкі абмежавалася дазволам пусьціць вучняў на фабрыку і толькі. Ніякай дапамогі кіраўніцтва практыкай вучняў як з боку інжынэрна-тэхнічных работнікаў, так і заводакіраўніцтва няма. Старшыня ТРР тав. Бяльневіч заявіў, што ім зараз не да вучняў, «да і людзей вольных няма». А дырэктар фабрыкі Астапенка сваю адмову дапамагчы політэхнізацыі школы тлумачыць тым, што «фабрыка—ня дойная карова». Гэты-ж дырэктар адмовіўся заключыць сакдагавор памёж школай і фабрыкай. Такім чынам кіраўніцтва фабрыкі ўсімі сіламі адмахваецца ад выкананьня важнейшых партыйных дырэктыў.

Ня гледзячы на дрэнная становішча з памяшканьнямі, гарсавет увесь час вядзе лінію на скарачэньне плошчы пад школамі, перасяляючы іх у дрэнныя будынкі. Як факт, можна прывесьці перасяленьне пулёўкі ў былое памяшканьне міліцыі.

Фабком фабрыкі «Гэрой працы» у справе дапамогі бяднейшым вучням усім нічога не зрабіў.

Ліквідацыяй няпісьменнасьці ахоплено менш 50 проц. няпісьменных, прычым акрамя настаўнікаў і вучняў школы ФЗС гэтай справай ніхто не займаецца.

Ні адна прафарганізацыя, у тым ліку і фабком, а таксама і камсамольская ячэйка ня вылучылі ні аднаго ліквідатара.

Існуючая пры школе вячэрняя рабочая школа наведваецца вусім слаба: замест 30-40 чал. у групе бывае ня больш 6-8. Атрымліваецца на сутнасьці дарэмная трата сродкаў.

Партыйная, савецкія, прафсаюзныя арганізацыі і камсамол—шэф усеагульнага навучаньня, павінны зараз-жа прыняць усе захады да таго, каб ліквідаваць гэтыя галопныя прарывы.

Язэп Чорны.

Апэрацыйная зводка

аб стане ўсеагульнага абавязковага навучаньня (па 38 раёнах) і ліквідацыі няпісьменнасьці (па 36 раёнах) на 10 сакавіка 1931 г.

Вызначана паводле пляну адкрыць новых школьных комплектаў 627.

Фактычна адкрыта 547.

Ёсьць на вучоце дзяцей 8-10-гадовага ўзросту, падлягаючых абавязковаму навучаньню—145.085 чал.

З іх фактычна ахоплена пачатковай школай—142.058 чал., што складае 97,9 проц. ахопу.

Ёсьць на вучоце падростку 11-15-гадовага ўзросту, падлягаючых абавязковаму навучаньню—47.555 чал.

З іх фактычна навучаецца ў школах—45.990 чал., што складае 96,7 проц.

Недахват настаўніцтва для 1-га канцэнтру складае 101 асобу.

Лік вучняў 1-га канцэнтру, забясьпечаных гарачым сьнеданьнем, складае 38.500 чал.

Лік вучняў 2-га канцэнтру, забясьпечаных гарачым сьнеданьнем, складае 5.929 чал.

Вучні школ для падростку, забясьпечаны гарачым сьнеданьнем у ліку 170 чал.

Ёсьць на вучоце няпісьменных ва ўзросьце ад 15 да 45 год—158.933 асобы.

З іх фактычна ахоплена навучаньнем—114.014 асоб, што складае 71,7 проц. ахопу.

Вызначана паводле пляну мабілізаваць добраахвотных культармейцаў—2.181 чал.

Фактычна мабілізавана 3.476 чал.

Апартуністычная недаацэнка—галоўны тормаз у ажыцьцяўленьні задачы ліквідацыі няпісьменнасьці

Партыйныя, камсамольскія і прафсыяніальныя арганізацыі на шмат якіх прадпрыемствах да сёньняшняга дня ня прынялі належных мер для палепшэньня работы ў справе ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці.

Факты, якія імі ніжэй падаем, з усёй выразнасьцю сьведчаць аб поўнай палітычнай недаацэнцы гэтай справы з боку пасобных партыйных калектываў, камсамольскіх ячэек і прафесыяніальных арганізацый на прадпрыемствах. Так, на заводзе «Дрэвапрацоўчых» (Менск) доўгі час, з прычыны раду бюракратычных перашкод, нельга было распачаць заняткаў ліквпункту. Нядбайныя адносіны фабзаўкому зьявіліся ў цягніну з прадстаўленьнем памяшканьня і правядзеньнем уліку колькасьці няпісьменных і малапісьменных рабочых на заводзе. Бюро партыйнай ячэйкі ня толькі ня ўзьвялічыла на гэта казныя адносіны кіраўніцкі фабкому, але і натурала ім. Сакратар ячэйкі замест прыняцьця адпаведных мер заявіў: «З гэтага нічога ня выйдзе». І толькі пасьля доўгай упартай работы ўдалося, нарэшце, адкрыць ліквпункт.

Але в прычыны абыякіх адносін з боку фабзаўкому, пад ліквпункт адведзен пракляты пакой. Да гэтага часу няма яшчэ поўнага ўліку колькасьці няпісьменных і малапісьменных. Абураючым зьяўляецца тое, што ячэйкі КП(б)Б і ЛКСМБ лічаць справу на гэтым скончанай і ня думаюць займацца палепшэньнем гэтай работы.

На фабрыцы «Беларуска», на шэйнай фабрыцы імя 8-га сакавіка і на Эльводзе ліквідацыя няпісьменнасьці і малапісьменнасьці пастаўлена яшчэ горш. Старшыня фабкому Эльводу, тав. Гаўрылюк, усімі сіламі адмахваецца ад кіраўніцкіх ліквпунктаў, заяўляючы: «Я наперад ведаю, што няпісьменныя і малапісьменныя на заняткі хадзіць ня будуць, а таму гэтай справай займацца нямэтазгодна».

Партыйныя калектыў і ячэйкі гэтай справай вусім займацца ня хочуць. Ня дзіва пасьля гэтага, што з усёй колькасьці няпісьменных і малапісьменных, якія ёсьць на Эльводзе, школу наведвае толькі 1-2 чал. Прыкладна такое-ж становішча на фабрыках «Беларуска» і імя 8-га сакавіка.

З пазначанага становішча відаць, што галоўнай прычынай у зрыве ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці на радзе заводаў зьяўляецца апартуністычная недаацэнка гэтай справы з боку партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый.

З-кі.

Рост... самацеку

Разгортваньне калектывізацыі бяднацка-сераднацкіх гаспадарак і падрыхтоўка да веснавой сяўбы ў прыгарадных сельсаветах гораду Віцебску праходзіць вельмі марудныміі тэмпамі. Гэта тлумачыцца выключна тым, што партыйныя ячэйкі і сельсаветы не скарыстоўваюць усіх магчымасьцяй для замацаваньня існуючых калгасаў, для арганізацыі новых, не замацоўваюць політычнай актыўнасьці бяднацка-сераднацкіх мас і вельмі часта бюракратычна адносяцца да пытаньняў калгаснага будаўніцтва.

За час падрыхтоўкі да веснавой сяўбы і ў дэкаду сталінскага прызыву на тэрыторыі 12 сельсаветаў арганізавана толькі 2 новых калгасы, у якіх аб'ядная 230 бяднацка-сераднацкіх гаспадарак. Процант калектывізацыі для прыгараднага раёну зьяўляецца недапушчальна нізкім, ён складае ўсяго 10-11 да агульнага ліку бяднацка-сераднацкіх гаспадарак.

Партыйныя ячэйкі за апошні час значна аслабілі змаганьне в сацыяльна-варожымі кулацкімі элементамі, якія імкнуцца дэзарганізаваць работу па падрыхтоўцы да бальшавіцкай сяўбы, затармазіць прыплыў бяднацка-сераднацкіх гаспадарак у калгасы. Кулацкім элементам удалося дамагчыся некаторага адліву з пасобных калгасаў. Так, у калгасе «1-га мая» колькасьць гаспадарак памяншылася на 7, у калгасе імя Чарвякова—на 2.

Такое становішча тлумачыцца выключна тым, што партыйныя ячэйкі і работнікі сельсаветаў не далі рашучага адпору кулацкай агітацыі, не супрацьпаставілі кулацкай хлусьні сапраўды бальшавіцкай работы па гаспадарным замацаваньні калгасаў і па падрыхтоўцы да сяўбы.

Слабое нарастаньне тэмпаў калектывізацыі ў прыгарадных сельсаветах можна вытлумачыць толькі тым, што масава-растлумачальная работа аб пераватах калгаснай гаспадарцы над аднаасобнай пастаўлена вельмі дрэнна. Парт'ячэйкі недаацэньваюць значэньня масавай работы ў пытаньні калгаснага будаўніцтва.

Работа прафсаюзаў у галіне калектывізацыі зьяўляецца зусім нездавальняючай. Прафсаюзы Віцебску яшчэ на справу будаўніцтва, не перайшлі ад агульных нізавым партыйным і савецкім органам у работе па калектывізацыі.

Падрыхтоўка да веснавой сяўбы праходзіць вельмі слаба, што стварае пасабліва тэта адносіцца да прыгарадных гаспадарак ЦРК. Вельмі марудна праходзіць загатоўкі пасеньня, загатоўлена толькі 30 проц. патрэбнай колькасьці.

Складаныя планы сяўбы ў радзе калгасаў прапрацаваны зусім нездавальняюча, не даведзены да кожнага калгаснага дарчага інвэнтару, машын, пасеньня і г. д.

Становішча з падрыхтоўкай у індывідуальным сэктары зьяўляецца далёка нездавальняючым.

Пленум Віцебскай ГарКК абгаварыўшы пытаньне аб становішчы калектывізацыі і падрыхтоўцы да веснавой сяўбы ў прыгарадных сельсаветах, прыняў рад канкрэтных мерапрыемстваў па разгортваньні сапраўды бальшавіцкіх тэмпаў у выкананьні дырэктыў партыі аб калектывізацыі.

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ.

Развал калгасу на вачох у раён нага парткіраўніцтва

Галоўным недахопам у рабоце раду парт'ячэек **Койданаўскай** раённай партарганізацыі зьяўляецца зусім невыстарчальная ўвага арганізацыі вытворчасьці ў калгасах. Многія ячэйкі ня здолелі мабілізаваць калгасныя масы на гаспадарчае ўзмацненьне арцеляй, наладзіць правільную арганізацыю працы, разгарнуць сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Падамо гэта на прыкладзе аднаго з буйнейшых калгасаў — **імя 9-га студзеня**, які знаходзіцца ў раённым цэнтры.

Гэты калгас арганізаваўся ў пачатку мінулага году з 70-ці бяднацка-сераднацкіх гаспадарак. Ня гледзячы на тое, што яго зямельныя ўжыткоўнасьці зьяўляюцца самымі лепшымі па якасьці ва ўсім раёне, што гэты калгас мае надзвычай вялікія пэрспэктывы для свайго гаспадарчага разьвіцьця,—усё-ж сучаснае становішча гаспадаркі вельмі кепскае.

Бязьдзейнасьць праўленьня калгасу і местачковай парт'ячэйкі давяла калгас да заняпаду. Там панае хранічная бесгаспадарчасьць. Дамо слова фактам. У мінулым годзе на вялікай плошчы былой кулацкай гаспадаркі быў пасеян ячмень, але пасеялі — і забыліся аб гэтым вучастку. Праўленьне калгасу нават ня ведала, дзе гэты ячмень быў пасеян. У выніку, пакуль адшукалі гэты ячмень, дык ён увесь асыпаўся на полі. Пры ўборцы пшаніцы «мядоўкі» каля 60 проц. зерня таксама асыпалася з той прычыны, што пшаніца перасьпела і ўборка не была арганізавана з вялікім спазьненьнем.

Гэтыя факты не паслужылі ўрокам ні для праўленьня калгасу, ні для ячэйкі. Бесгаспадарчасьць панае і далей. Зьвезеная з поля ярына была складзена ў стагі бесгаспадарча і амаль уся, знаходзячыся пад дажджом, пасавалася. Зерня ў снапох настольні пасавалася. Зерня ў снапох настольні пасаравалася, што пры малацьбе часта псавалася машына, давала перабої ў рабоце і спынялася для рамонту.

Ня лепшая справа і ў іншых галінах гаспадаркі. З-за недагляду і злачынная нядбайнасьці згінулі за зіму дзесяткі вульлёў. Пастаўленае яшчэ ў мінулым годзе сьвіное стада не павялічваецца, а наадварот, зьмяншаецца.

Такая злачынная бесгаспадарчасьць творыцца на вачох местачковай ячэйкі і койданаўскіх раённых кіруючых арганізацый. Аднак, ніхто на гэта не рэагуе. Наглядаецца поўнае апартуністычнае «благодушіе» да развалу калектыўнай гаспадаркі.

У складзе калгаснікаў ёсьць кулацкія элементы, якія праводзяць там падрыўную работу. Працоўная дысцыпліна зусім слабая. Падрыхтоўчай работы да веснавой сяўбы амаль не праводзіцца. Новага калгаснага прыліву няма. Усё прадастаўлена самацёку. Сярод часткі калгасьнікаў ёсьць імкненьні пакінуць калгас і то пераважна... з заможнікаў вёскі, да якое даведзены былі цьвёрдыя заданьні па загатоўках. Пры арганізацыі гэтага калгасу ачэйка не кіравалася дырэктывамі партыі пакоп прыёму заможнікаў.

На гаспадарчае ўзмацненьне арганізаванага з пачатку мінулага году калгасу ячэйка не зварачала ўвагі. Да гэтага часу няма правільнай арганізацыі працы ў гэтым калгасе, адсутнічае вучот, працоўная дысцыпліна ня ўзьнята на належную вышыню, але ніякіх захадаў ня ўжываецца з боку ячэйкі для зьнішчэньня гэтых недахопаў.

Праўда, сакратар ячэйкі прызнае на сходах недахопы ў рабоце, часамі «самакрытыкуецца», але зруху ў рабоце няма. Як і раней, пануюць апартуністычныя адносіны да выкананьня важнейшых дырэктыў партыі па калектывізацыі сельскай гаспадарцы.

Работа на правядзеньні гаспадарчапалітычных кампаній у сельсавеце ячэйка ня ўвязвала з задачамі калектывізацыі. У выніку за ўвесь час, г. зн. за год арганізаваны толькі адзін невялічкі калгас і то пераважна... з заможнікаў вёскі, да якое даведзены былі цьвёрдыя заданьні па загатоўках. Пры арганізацыі гэтага калгасу ачэйка не кіравалася дырэктывамі партыі пакоп прыёму заможнікаў.

На гаспадарчае ўзмацненьне арганізаванага з пачатку мінулага году калгасу ячэйка не зварачала ўвагі. Да гэтага часу няма правільнай арганізацыі працы ў гэтым калгасе, адсутнічае вучот, працоўная дысцыпліна ня ўзьнята на належную вышыню, але ніякіх захадаў ня ўжываецца з боку ячэйкі для зьнішчэньня гэтых недахопаў.

Праўда, сакратар ячэйкі прызнае на сходах недахопы ў рабоце, часамі «самакрытыкуецца», але зруху ў рабоце няма. Як і раней, пануюць апартуністычныя адносіны да выкананьня важнейшых дырэктыў партыі па калектывізацыі сельскай гаспадарцы.

Работа ячэйкі пачала быць узята пад жорсткую бальшавіцкую самакрытыку і ўжыты захады да выкарчоўваньня апартуністычнай практыкі.

ТАРАС ЗДОЛЬНЫ.

Агентура клясавага ворага выкінута з радоў камсамолу

Камсамольская ячэйка арцелі № 3 «Чырвоны інвалід» БСІК'а ўвесь час сталла ў бажу ад змаганьня рабочых майстэрань за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, за павышэньне якасьці прадукцыі. Ячэйка на выкапала пастаноў X-га зьезду ЛКСМБ, дырэктыў партыі аб рашучай перабудове работы, аб паваротце тварам да задач сацыялістычнай рэканструкцыі.

Палітычная бязьдзейнасьць ячэйкі перарасла ў праваапартуністычную практыку. Сакратар камсамольскай ячэйкі Красік замест мабілізацыі масы камсамольцаў і беспартыйнай рабочай моладзі на выкананьне задач трэцяга году пяцігодкі, замест змаганьня за бальшавіцкія тэмпы работы праводзіў лінію, накіраваную на зрыў і дэзарганізацыю работы калектыву рабочых майстэрань. Красік яшчэ вусім нядаўна быў адным з актыўных кіраўнікоў сіяніцкай арганізацыі, скрыта выступаў і вёў работу супроць дыктатуры пралетарыяту, знаходзіўся ў цеснай сувязі з нэпманскімі элементамі.

Страціўшы ўсялякія надзеі на посьпехі сваёй контр-рэвалюцыйнай работы, Красік абгарбоўваецца ў чырвоны колер і як «беспартыйны актывіст» уступае ў камсамол.

Красік выкарыстаў слабае кіраўніцтва з боку парт'ячэйкі ячэйкай ЛКСМ для сваёй дэзарганізатарскай работы. Пераканаўшыся ў тым, што партыйная ячэйка вусім ня цікавіцца работай камсамольскай ячэйкі, Красік пачаў адкрыта выступаць на камсамольскіх сходах супроць заданьняў па прамфінпляне, якія ён лічыў нерэальнымі і імкнуўся даводзіць, што пяцігадовы плян ні ў якім разе ня можа быць выкананы. Красік свае контр-рэвалюцыйныя погляды імкнуўся перанесьці ў асяродзішча камсамольскай і беспартыйнай рабочай моладзі.

Красік у сваёй контр-рэвалюцыйнай рабоце апіраўся на «камсамольцаў», якія яшчэ вусім нядаўна пакінулі гандаль і, працаваўшы не вытворчасьць, праводзілі там падрыўную дэзарганізацыйную работу.

Сход рабочых арцелі № 3, абгаварыўшы пастанову бюро парткалектыву аб роспуску камсамольскай ячэйкі за праваапартуністычную практыку, аб выключэньні з камсамолу контр-рэвалюцыйных, антысавецкіх элементаў, у сваёй пастанове адзначыў, што Красіні, Лейбо, Плісіны, ня гледзячы на ўпартыя жаданьні сарваць змаганьне рабочага калектыву за высокія бальшавіцкія тэмпы работы, пацярпелі поўнае паражэньне, іх намаганьні разьбіці дашчэнту рабочыя майстэрань высока-сьвядомымі адносінамі да выкананьня задач трэцяга году пяцігодкі.

Сход рабочых узьняў хадайніцтва перад праўленьнем арцелі аб зьняцьці з работы Красіка, Лейбо і Плісіна, як дэзарганізатараў вытворчасьці.

Рабочыя арцелі № 3 на контр-рэвалюцыйную вылазку Красіка і К° адказалі дадатковай падпіскай на пазыку «Пяцігодка за чатыры гады», арганізацыяй новых ударных брыгад.

М.

ПАД АГОНЬ САМАКРЫТЫКІ

Пасьля выпраўленьня «лявацкіх» перагібаў у мінулай рабоце ячэйкі камуны імя Сталіна (Парыцкі раён) ячэйка шарахнулася ўправа, прадаставіўшы справу калектывізацыі самацёку.

Адзіны калгас у сельсавеце, які абслугоўвае ячэйка камуны, на працягу ўсяго году ня меў росту за лік новых гаспадарак. Ячэйка не праводзіць ніякай работы сярод бяднацка-сераднацкіх мас па ап

ПАСТАНОВЫ VI ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ У МАСЫ

„Толькі той бядняк і серадняк-аднаасобнік усё яшчэ застаецца саюзьнікам рабочае клясы, хто разам з рабочай клясай дапамагае будаваць калгасы, хто падтрымлівае калгасны рух, хто дапамагае весьці рашучае змаганьне з кулаком Для таго, каб стаць сапраўднай і моцнай апорай савецкай улады, перад бедняком і серадняком—аднаасобнікам адзін шлях—шлях дапамогі калгасам, а потым і ўступленьня ў калгас“

Аб калгасным будаўніцтве

Заслухаўшы і абыркаваўшы даклад НКЗему Саюзу ССР і судакладу Калгасцэнтру і Трактарацэнтру аб калгасным будаўніцтве, VI зьезд саветаў Саюзу ССР пастанаўляе:

I.
ВЫНІКІ КАЛГАСНАГА РУХУ І ПЕРАВАГІ КАЛГАСАЎ ПЕРАД АДНААСОБНЫМІ ГАСПАДАРКАМІ

Рэпаючыя вынікі калгаснага руху за мінулыя гады эксплюацыя ў тым, што калгасны шлях праверан мільёнамі сялян на ўласным вопыце і ацэнен імі, як адзіны шлях, які вызваляе іх ад кулацкай кабалы і вядзе да вольнага калгаснага жыцьця.

1. Лік сялянскіх гаспадарак, якія аб'ядналися ў калгасы, непарыўна нарастае з году ў год: у 1928 годзе аб'ядналася ў калгасах 400.000 гаспадарак, у 1929 г. — 1 мільён, у 1930 г. — 6 мільёнаў і па 10 сакавіка 1931 г. — 9.400.000 ці 37 проц. усіх бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак Саюзу ССР.

На 10 сакавіка 1931 году аб'ядналася ў калгасы:

а) па асноўных збожжавых раёнах (Паўночны Каўказ, Ніжняя Волга, стэпавая паласа Украіны, Крым, Заволжа Сярэдняй Волгі) — 3.000.000 гаспадарак (74 проц. усіх бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак);

б) па астатніх збожжавых раёнах — 3.800.000 гаспадарак (40 проц. усіх бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак);

в) па спажываючай паласе і нацыянальных раёнах — 2.600.000 гаспадарак (22 проц. усіх бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак);

2. Пасеўныя плошчы калгасаў растуць непарыўна з году ў год яшчэ шпарчэй, чым расьце лік гаспадарак, якія аб'ядналіся ў калгасах: у 1928 годзе калгасы засеялі (вясной і восенью) 2 млн. гектараў, у 1929 г. — 6,5 млн. гэкт., у 1930 г. — 43 млн. гэкт.

Такі вялікі рост тлумачыцца на толькі тым, што расьце лік гаспадарак, якія аб'ядналіся ў калгасах, але і тым, што на адзін калгасны двор прыпадае значна больш пасеваў, чым на адну аднаасобную гаспадарку.

Вясной 1930 г. пасеў на адзін двор складаў па Саюзе ССР: 2,7 гэкт. у аднаасобнікаў і 5,2 гэкт. у калгасах (перавышэньне амаль у два разы); па асноўных збожжавых раёнах: у аднаасобнікаў — 3,7 гэкт., а ў калгасах — 7,7 гэкт. на двор (перавышэньне больш, чым у два разы); па астатніх збожжавых раёнах: у аднаасобнікаў — 2,9 гэкт., а ў калгасах — 4,6 гэкт. на двор (перавышэньне больш чым у 1½ разы); па спажываючай паласе і нацыянальных раёнах: у аднаасобнікаў — 2,2 гэкт., а ў калгасах — 2,8 гэкт. на двор (перавышэньне на ¼)

3. Такое значнае перавышэньне калгаснага пасеву над індывідуальным тлумачыцца перш за ўсё тым, што калгас ёсьць буйная аб'яднаная гаспадарка, якая мае магчымасьць ужываць і найлепш выкарыстоўваць трактары, сельска-гаспадарчыя машыны і г. д., тады як аднаасобная гаспадарка ёсьць дробная гаспадарка, пазбаўленая такой магчымасьці. Нават конь дае ў калгасе больш, чым у аднаасобніка.

Вядома, што конь у калгаснай гаспадарцы ў 1930 г., ня гледзячы на ўсе недахопы ў выкарыстоўваньні коний, усё-ж апрацоўваў у 1½-2 разы большую плошчу, чым у аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках.

Перавышэньне калгаснага пасеву тлумачыцца, апрача таго, тым, што калгасы, як гаспадаркі буйныя і таварыскія, маюць магчымасьць карэнным чынам палепшыць агратэхнічную пастаноўку справы (вынічэньне межаў, пасеў сучэльным масывам, ачыстка і пратручваньне ўсяго пасеўнага матар'ялу, ужываньне радковага пасеву і г. д.), тады як індывідуальныя гаспадаркі, як правіла, пазбаўлены такой магчымасьці.

Гэтай акалічнасьцю і трэба вытлумачыць той факт, што, ня гледзячы на вялікія недахопы, якія мелі месца ў арганізацыі ўборкі з прычыны навізны справы, ураджай збожжа ў калгасах у 1930 г. перавысіў у сярэднім ураджай у аднаасобнай гаспадарцы па меншай меры на 10-15 проц.

4. У выніку ўсяго гэтага ўзрасьлі дабрабыт калгасьнікаў і таварнасьць калгаснай гаспадаркі:

а) даход ад сельскай гаспадаркі на душу калгаснага насельніцтва за 1930 г. аказаўся вышэй душавога даходу аднаасобнікаў ня менш, чым у 1½ разы, што для калгасьніка, ранейшага бедняка-аднаасобніка, азначае павышэньне даходу ня менш, чым у два разы;

б) праданая ў 1930 годзе калгасамі дзяржаве таварная прадукцыя збожжавых культур (460 млн. пудоў) перавысіла больш чым у 3½ разы размеры таварнага па-заняковага збожжа кулакоў у 1926-1927 годзе (126 млн. пуд.) і больш чым у 1,6 разы даваенную таварную прадукцыю памешчыцкай гаспадаркі (280 млн. пудоў);

в) ня гледячы на тое, што ў радзе калгасаў справа адачы (продажу) таварнага збожжа дзяржаве была пастаўлена неадасальніча, плян збожжазагатовак у 1930 г. калгасы выканалі поўнасьцю і ў тэрмін.

5. У рэзультаце ўступленьня мільёнаў сялян на шлях калектывізацыі вымяшчаецца аблічча ўсёй нашай сельскай гаспадаркі. Месца маланрадукцыйнасьці дробнай і адсталай аднаасобнай сялянскай гаспадаркі займае буйная аб'яднаная калектыўная гаспадарка, якая ўзброена новай тэхнікай і дае высокую прадукцыйнасьць.

Гэта факт, што 85.000 буйных калектыўных гаспадарак, якія стварыліся шляхам аб'яднаньня 6 млн. бядняцкіх і серадняцкіх аднаасобных дробных сялянскіх гаспадарак, засеялі вясной 1930 г. 32,8 млн. гектараў, у той час, як астатнія 20 млн. аднаасобных сялянскіх гаспадарак засеялі ўсяго 52,8 млн. гектараў. Гэта азначае, што 85.000 калектыўных гаспадарак аказаліся ў стане засеяць на сваіх палёх больш паловы (62 проц.) усяго таго пасеву, які змаглі правесьці 20 млн. аднаасобных сялянскіх гаспадарак.

Наша краіна, краіна дробнай сялянскай гаспадаркі, зруйнаванай нашчэнт памешчыкамі і кулакамі, становіцца краінай самай буйной, самай перадавой сельскай гаспадаркі ў сьвеце.

6. Такі асноўны вынік ажыцьцяўленьня палітыкі ленінскай партыі.

Дзякуючы гэтай палітыцы мы вышлі з крызісу збожжавай гаспадаркі.

Дзякуючы гэтай палітыцы перамаглі мы голад.

У выніку практычнага правядзеньня гэтай палітыкі мільёны сялян, якія правялі калектыўна веснавы і асенні пасеў у 1930 г., ня в кніг і тэаретычных разважаньняў, а на ўласным вопыце пераканаліся ў правільнасьці ўказаньняў Леніна аб тым, што:

«Дробным гаспадаркам з галечы ня выйсьці». (Ленін).

«Калі мы будзем сядзець па-старому ў дробных гаспадарках, хоць і вольныя грамадзяне на вольнай зямлі, нам усё роўна пагражае нямінучая пагібель». (Ленін).

«Толькі пры дапамозе агульнай, арцельнай, таварыская працы можна выйсьці з тупіку, у які загнала нас імпэрыялістычная вайна». (Ленін).

«У два і ў тры разы ўзьнялася-б прадукцыйнасьць працы; у два і ў тры разы была-б захавана чалавечая праца для зямлеробства і чалавечай гаспадаркі, калі-б ад гэтай раздробленай і дробнай гаспадаркі адбыўся пераход да гаспадаркі грамадзкай». (Ленін).

II.
ДАПАМОГА САВЕЦКАЙ ДЗЯРЖАВЫ СЯЛЯНАМ, БУДУЮЧЫМ КАЛГАСЫ

Ідучы па станох Леніна, савецкая ўлада аказвае калгасам дапамогу, якая з году ў год усё больш пашыраецца. Савецкая ўлада аказвае дапамогу галоўным чынам, калгасам таму, што толькі такая дапамога зьяўляецца адзіным і сапраўдным відам дапамогі, які дае магчымасьць бедняку і серадняку выйсьці з галечы і зьбядненьня і назаўсёды вызваліцца ад кулацкай кабалы і эксплёатацыі.

У 1931 годзе, дзякуючы пасьпяховаму выкананьню пляну індустрыялізацыі Саюзу ССР і перавыкананьню заданьня на першыя два гады пяцігодкі, савецкая ўлада значна ўзмацніла ў параўнаньні з 1930 г. дапамогу калгасам:

1) накіроўвае ў сельскую гаспадарку 120.000 трактараў (у пераводзе на 10-сільны трактар);

2) арганізуе 1.040 новых машына-трактарных станцый (апрача існуючых);

3) падвойвае забесьпячэньне сельскае гаспадаркі і калгасаў сельска-гаспадарчымі машынамі (на суму 768 млн. руб. замест 400 млн. руб. у мінулым годзе), у прыватнасьці ўпярэдзе накіроўваецца ў сельскую гаспадарку 7.000 грузавых і лёгкіх аўтамабіляў;

4) адпускае сельскай гаспадарцы 24 млн. цэнтнераў (145 млн. пудоў) угнаньняў і на 40 млн. руб. сродкаў барацьбы са шкоднікамі;

5) адпускае калгасам 21 млн. цэнтнераў (126 млн. пуд.) палепшанага і гатунковага насеньня;

6) адпускае калгасам і машына-трактарным станцыям 1 млрд. 50 млн. руб. па бюджэце і доўгатэрміновым крэдыце і, апрача таго, 350 млн. руб. у парадку аванса пасеўшчыкам, якія кантрактуюць прадукцыю свайго паляводзтва.

III.
КАЛГАСЫ ЦІ АДНААСОБНАЯ ГАСПАДАРКА

Пераможны калгасны рух рашуча зьмяняе суадносіны класавых сіл у Саюзе ССР.

1. На аснове разгортваньня суцэльнай калектывізацыі савецкая ўлада перайшла да ліквідацыі кулацтва як класы і пасьпяхова ажыцьцяўляе гэту палітыку на працягу апошняга году. Серадняк, які ўступіў у калгас, пабач з калгасьнікам — ранейшым батракам і бедняком — ператвараецца ў сапраўдную і моцную апору савецкай улады ў вёсцы.

Тым самым у вялізарнай меры ўмацоўваецца змычка рабочай клясы з сялянствам, пашыраецца фундамант рабоча-сялянскай улады, для якой адгэтуль асноўнай і галоўнай апорай у вёсцы зьяўляецца калгасное сялянства.

Цалкам апраўдваюцца словы Леніна:

«Толькі ў тым выпадку, калі ўдасца на справе паказаць сялянам перавагі грамадзкай, калектыўнай таварыскай, арцельнай апрацоўкі зямлі, толькі калі ўдасца дапамагчы селяніну пры дапамозе таварыскай арцельнай гаспадаркі, тады толькі рабочая кляса, якая трымае ў сваіх руках дзяржаўную ўладу, сапраўды давядзе селяніну сваю правату, сапраўды прыцягне на свой бок моцна і надзейным чынам многамільённую сялянскую масу». (Ленін).

2. Цяпер, калі многамільённыя масы беднякоў і сераднякоў, пераканаўшыся ў перавагах калгасаў, уступілі на калгасны шлях, а кулацтва, — асноўны вораг калгасаў — ліквідуецца як кляса — перад кожным бедняком і серадняком-аднаасобнікам, ягчэ няўступіўшым у калгас, паўстала асноўнае пытаньне — за, ці супроць калгасу.

Бядняк і серадняк — аднаасобнік, які дапамагае кулаку змагацца в калгасамі і падрывае калгасное будаўніцтва, ня можа быць названы саюзьнікам і тым больш апорай рабочай клясы, — ён на справе саюзьнік кулака.

Толькі той бядняк і серадняк — аднаасобнік застаецца саюзьнікам рабочай клясы, хто разам з рабочай клясай дапамагае будаваць калгасы, хто падтрымлівае калгасны рух, хто дапамагае весьці рашучую барацьбу з кулаком.

Для таго, каб арабіцца сапраўднай і моцнай апорай савецкай улады, перад бедняком і серадняком — аднаасобнікам адзін шлях — шлях дапамогі калгасам, а пасьля і ўступленьня ў калгасы.

Зьезд саветаў перакананы, што масавы вопыт калгасаў у найкарацейшы тэрмін пераканае беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў у выгадзе пераходу ў калгасы, і яны ўступяць пад калгасны сьцяг.

VI зьезд саветаў Саюзу ССР абавязвае работнікаў калгаснага руху і ўсе арганізацыі савецкай улады цярпліва і настойліва весьці растлумачальную работу сярод аднаасобнікаў, накіраваную да таго, каб пераканаць масы сялян стаць на шлях калектывізацыі.

Ход калектывізацыі на працягу апошніх тыдняў (за студзень, люты і першую дэкаду сакавіка ў калгасы ўступіла 2,8 млн. сялянскіх гаспадарак) паказвае, што новыя мільёны сялянскіх гаспадарак ужо вырашылі пытаньне аб тым, з кім ім ісьці — з рабочай клясай і ўсім калгасным сялянствам — за калгасы, ці з кулаком — супроць калгасаў.

IV.
ГАЛОЎНЕЙШЫЯ НЕДАХОПЫ Ў ПРАЦЫ КАЛГАСАЎ

Мільёны сялянскіх гаспадарак, уступіўшых у калгасы ў 1930 г., змаглі ўжо ў першую калгасную сяўбу ўвесну 1930 г. на многа павысіць у параўнаньні з аднаасобнай гаспадаркай, прадукцыйнасьць працы і скарыстаньне машын і прылад. Аднак, тыя магчымасьці павышэньня прадукцыйнасьці працы пры адначасовым яе палягчэньні, якія закладзены ў буйной калектыўнай гаспадарцы, былі скарыстаны далёка ня поўнасьцю дзякуючы раду сур'ёзных недахопаў у рабоце калгасаў.

Самымі галоўнымі і самымі шкодлівымі недахопамі ў рабоце калгасаў у 1930 годзе былі, па-першае, размеркаваньне калгаснага прыбытку, не па колькасьці і якасьці працы калгасьніка, а па душах; і, па-другое, няўмелая і дрэнная арганізацыя працы, у асаблівасьці пры ўборцы ўраджаю.

1. Размеркаваньне даходу па душах а не па колькасьці і якасьці працы калгасьніка мела месца ў радзе выпадкаў, у асаблівасьці ў калгасах Сярэдняй Волгі, Паўночнага Каўказу і Сібіры, і ва ўсіх выпадках цягнула за сабой падрыў матар'яльнай зацікаўленасьці калгасьніка ў рэзультатах калгаснага вытворства, рэзкае паніжэньне прадукцыйнасьці працы, памяншэньне выхаду калгасьнікаў на працу і ў выніку — памяншэньне прыбытку калгасьніка. У такіх калгасах адны калгасьнікі, лепшыя і найбольш сьвядомыя, найбольш адданыя агульнай справе, працавалі сумленна, а другія ўхіляліся ад працы і скарыстоўвалі калгас, як сродак пажыць за кошт чужой працы, сарваць ад грамадзкай працы найбольш, працуючы менш. Размеркаваньне прыбытку (як грашовых, так і натуральных) не па колькасьці і якасьці ўкладзенай калгасьнікам працы, а па душах, вельмі часта прапаведвалася кулакамі і другімі ворагамі калгасаў, якія прабуюць сарваць калгасную справу. Такім аматарам пажыць за кошт чужой працы неабходна аказваць самы рашучы адпор, аж да выключэньня іх з калгасу.

Размеркаваньне калгасных прыбыткаў па прыцыпе — хто больш і лепш працуе, той больш атрымлівае, хто не працуе, той нічога не атрымлівае, — павінна зрабіцца правілам для ўсіх калгасьнікаў і калгасаў. Адпаведна гэтаму ў асноўных с.-г. работах, ворыве, сяўбе, поліве, уборцы, малацьбе — масавае распаўсюджваньне павінна атрымаць выдзельная работа, якая ацэньваецца ў працаднёх. Толькі на гэтай падставе можа быць умацавана працоўная дысцыпліна і добра арганізавана работа ў калгасах. Правільная арганізацыя працы ў калгасах становіцца такім чынам тэй задачай, ад пасьпяховасьці вырашэньня якой залежыць пры бытак калгасу і далейшае яго ўмацаваньне. Дапамога калгасьнікам у адносінах правільнай арганізацыі працы, распаўсюджваньне выдзельшчыны і ўстанаўленьне размеркаваньня прыбыткаў на працы вызначаюцца важнейшай задачай зямельных і калгасных органаў.

2. Другім надзвычай важным недахопам у рабоце калгасаў зьявілася дрэнная арганізацыя ўборкі (у прыватнасьці бавоўны і ільну, а ў радзе раёнаў і збожжа), у выніку чаго ў радзе выпадкаў загінула нематорая частка калгаснага ўраджаю і паменшылася колькасьць бавоўны, ільну і іншых культур, здаваных (прадаваных) калгасамі дзяржаве. Дрэнная арганізацыя ўборкі наносіць вялізарную шкоду як калгасьнікам памяншэньнем іх прыбытку, так і дзяржаве ў выніку невыкананьня асобнымі калгасамі іх абавязацельстваў па здачы (продажы) дзяржаве таварнай прадукцыі ў разьмерах, якія прадугледжаны дагаворамі аб кантрактацыі. Неабходна дабіцца ў 1931 г. сапраўднага палепшэньня пастаноўкі ўсёй справы ўборкі як збожжавых, так і тэхнічных культур. Таму адначасова з арганізацыяй сяўбы, неабходна дакладна рыхтавацца да ўборачнай кампаніі, каб забясьпечыць правільную арганізацыю працы, лепшае скарыстаньне машын і на гэтай аснове рэзкае памяншэньне страт пры ўборцы і павялічэньне таварнай прадукцыі калгасаў.

V.
ДАЛЕЙШЫЯ ЗАДАЧЫ КАЛГАСНАГА БУДАЎНІЦТВА

Пасьпяховае выкананьне Саюзам ССР пяцігадовага пляну разьвіцьця індустрыялізацыі Саюзу ССР і перавыкананьню заданьня на першыя два гады пяцігодкі, савецкая ўлада значна ўзмацніла ў параўнаньні з 1930 г. дапамогу калгасам:

1) накіроўвае ў сельскую гаспадарку 120.000 трактараў (у пераводзе на 10-сільны трактар);

2) арганізуе 1.040 новых машына-трактарных станцый (апрача існуючых);

3) падвойвае забесьпячэньне сельскае гаспадаркі і калгасаў сельска-гаспадарчымі машынамі (на суму 768 млн. руб. замест 400 млн. руб. у мінулым годзе), у прыватнасьці ўпярэдзе накіроўваецца ў сельскую гаспадарку 7.000 грузавых і лёгкіх аўтамабіляў;

4) адпускае сельскай гаспадарцы 24 млн. цэнтнераў (145 млн. пудоў) угнаньняў і на 40 млн. руб. сродкаў барацьбы са шкоднікамі;

5) адпускае калгасам 21 млн. цэнтнераў (126 млн. пуд.) палепшанага і гатунковага насеньня;

6) адпускае калгасам і машына-трактарным станцыям 1 млрд. 50 млн. руб. па бюджэце і доўгатэрміновым крэдыце і, апрача таго, 350 млн. руб. у парадку аванса пасеўшчыкам, якія кантрактуюць прадукцыю свайго паляводзтва.

III.
КАЛГАСЫ ЦІ АДНААСОБНАЯ ГАСПАДАРКА

Пераможны калгасны рух рашуча зьмяняе суадносіны класавых сіл у Саюзе ССР.

1. На аснове разгортваньня суцэльнай калектывізацыі савецкая ўлада перайшла да ліквідацыі кулацтва як класы і пасьпяхова ажыцьцяўляе гэту палітыку на працягу апошняга году. Серадняк, які ўступіў у калгас, пабач з калгасьнікам — ранейшым батракам і бедняком — ператвараецца ў сапраўдную і моцную апору савецкай улады ў вёсцы.

Тым самым у вялізарнай меры ўмацоўваецца змычка рабочай клясы з сялянствам, пашыраецца фундамант рабоча-сялянскай улады, для якой адгэтуль асноўнай і галоўнай апорай у вёсцы зьяўляецца калгасное сялянства.

Цалкам апраўдваюцца словы Леніна:

«Толькі ў тым выпадку, калі ўдасца на справе паказаць сялянам перавагі грамадзкай, калектыўнай таварыскай, арцельнай апрацоўкі зямлі, толькі калі ўдасца дапамагчы селяніну пры дапамозе таварыскай арцельнай гаспадаркі, тады толькі рабочая кляса, якая трымае ў сваіх руках дзяржаўную ўладу, сапраўды давядзе селяніну сваю правату, сапраўды прыцягне на свой бок моцна і надзейным чынам многамільённую сялянскую масу». (Ленін).

2. Цяпер, калі многамільённыя масы беднякоў і сераднякоў, пераканаўшыся ў перавагах калгасаў, уступілі на калгасны шлях, а кулацтва, — асноўны вораг калгасаў — ліквідуецца як кляса — перад кожным бедняком і серадняком-аднаасобнікам, ягчэ няўступіўшым у калгас, паўстала асноўнае пытаньне — за, ці супроць калгасу.

Бядняк і серадняк — аднаасобнік, які дапамагае кулаку змагацца в калгасамі і падрывае калгасное будаўніцтва, ня можа быць названы саюзьнікам і тым больш апорай рабочай клясы, — ён на справе саюзьнік кулака.

Толькі той бядняк і серадняк — аднаасобнік застаецца саюзьнікам рабочай клясы, хто разам з рабочай клясай дапамагае будаваць калгасы, хто падтрымлівае калгасны рух, хто дапамагае весьці рашучую барацьбу з кулаком.

Для таго, каб арабіцца сапраўднай і моцнай апорай савецкай улады, перад бедняком і серадняком — аднаасобнікам адзін шлях — шлях дапамогі калгасам, а пасьля і ўступленьня ў калгас.

Зьезд саветаў перакананы, што масавы вопыт калгасаў у найкарацейшы тэрмін пераканае беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў у выгадзе пераходу ў калгасы, і яны ўступяць пад калгасны сьцяг.

VI зьезд саветаў Саюзу ССР абавязвае работнікаў калгаснага руху і ўсе арганізацыі савецкай улады цярпліва і настойліва весьці растлумачальную работу сярод аднаасобнікаў, накіраваную да таго, каб пераканаць масы сялян стаць на шлях калектывізацыі.

Ход калектывізацыі на працягу апошніх тыдняў (за студзень, люты і першую дэкаду сакавіка ў калгасы ўступіла 2,8 млн. сялянскіх гаспадарак) паказвае, што новыя мільёны сялянскіх гаспадарак ужо вырашылі пытаньне аб тым, з кім ім ісьці — з рабочай клясай і ўсім калгасным сялянствам — за калгасы, ці з кулаком — супроць калгасаў.

IV.
ГАЛОЎНЕЙШЫЯ НЕДАХОПЫ Ў ПРАЦЫ КАЛГАСАЎ

Мільёны сялянскіх гаспадарак, уступіўшых у калгасы ў 1930 г., змаглі ўжо ў першую калгасную сяўбу ўвесну 1930 г. на многа павысіць у параўнаньні з аднаасобнай гаспадаркай, прадукцыйнасьць працы і скарыстаньне машын і прылад. Аднак, тыя магчымасьці павышэньня прадукцыйнасьці працы пры адначасовым яе палягчэньні, якія закладзены ў буйной калектыўнай гаспадарцы, былі скарыстаны далёка ня поўнасьцю дзякуючы раду сур'ёзных недахопаў у рабоце калгасаў.

Самымі галоўнымі і самымі шкодлівымі недахопамі ў рабоце калгасаў у 1930 годзе былі, па-першае, размеркаваньне калгаснага прыбытку, не па колькасьці і якасьці працы калгасьніка, а па душах; і, па-другое, няўмелая і дрэнная арганізацыя працы, у асаблівасьці пры ўборцы ўраджаю.

1. Размеркаваньне даходу па душах а не па колькасьці і якасьці працы калгасьніка мела месца ў радзе выпадкаў, у асаблівасьці ў калгасах Сярэдняй Волгі, Паўночнага Каўказу і Сібіры, і ва ўсіх выпадках цягнула за сабой падрыў матар'яльнай зацікаўленасьці калгасьніка ў рэзультатах калгаснага вытворства, рэзкае паніжэньне прадукцыйнасьці працы, памяншэньне выхаду калгасьнікаў на працу і ў выніку — памяншэньне прыбытку калгасьніка. У такіх калгасах адны калгасьнікі, лепшыя і найбольш сьвядомыя, найбольш адданыя агульнай справе, працавалі сумленна, а другія ўхіляліся ад працы і скарыстоўвалі калгас, як сродак пажыць за кошт чужой працы, сарваць ад грамадзкай працы найбольш, працуючы менш. Размеркаваньне прыбытку (як грашовых, так і натуральных) не па колькасьці і якасьці ўкладзенай калгасьнікам працы, а па душах, вельмі часта прапаведвалася кулакамі і другімі ворагамі калгасаў, якія прабуюць сарваць калгасную справу. Такім аматарам пажыць за кошт чужой працы неабходна аказваць самы рашучы адпор, аж да выключэньня іх з калгасу.

Размеркаваньне калгасных прыбыткаў па прыцыпе — хто больш і лепш працуе, той больш атрымлівае, хто не працуе, той нічога не атрымлівае, — павінна зрабіцца правілам для ўсіх калгасьнікаў і калгасаў. Адпаведна гэтаму ў асноўных с.-г. работах, ворыве, сяўбе, поліве, уборцы, малацьбе — масавае распаўсюджваньне павінна атрымаць выдзельная работа, якая ацэньваецца ў працаднёх. Толькі на гэтай падставе можа быць умацавана працоўная дысцыпліна і добра арганізавана работа ў калгасах. Правільная арганізацыя працы ў калгасах становіцца такім чынам тэй задачай, ад пасьпяховасьці вырашэньня якой залежыць пры бытак калгасу і далейшае яго ўмацаваньне. Дапамога калгасьнікам у адносінах правільнай арганізацыі працы, распаўсюджваньне выдзельшчыны і ўстанаўленьне размеркаваньня прыбыткаў на працы зьяўляюцца важнейшай задачай зямельных і калгасных органаў.

2. Другім надзвычай важным недахопам у рабоце калгасаў зьявілася дрэнная арганізацыя ўборкі (у прыватнасьці бавоўны і ільну, а ў радзе раёнаў і збожжа), у выніку чаго ў радзе выпадкаў загінула нематорая частка калгаснага ўраджаю і паменшылася колькасьць бавоўны, ільну і іншых культур, здаваных (прадаваных) калгасамі дзяржаве. Дрэнная арганізацыя ўборкі наносіць вялізарную шкоду як калгасьнікам памяншэньнем іх прыбытку, так і дзяржаве ў выніку невыкананьня асобнымі калгасамі іх абавязацельстваў па здачы (продажы) дзяржаве таварнай прадукцыі ў разьмерах, якія прадугледжаны дагаворамі аб кантрактацыі. Неабходна дабіцца ў 1931 г. сапраўднага палепшэньня пастаноўкі ўсёй справы ўборкі як збожжавых, так і тэхнічных культур. Таму адначасова з арганізацыяй сяўбы, неабходна дакладна рыхтавацца да ўборачнай кампаніі, каб забясьпечыць правільную арганізацыю працы, лепшае скарыстаньне машын і на гэтай аснове рэзкае памяншэньне страт пры ўборцы і павялічэньне таварнай прадукцыі калгасаў.

V.
ДАЛЕЙШЫЯ ЗАДАЧЫ КАЛГАСНАГА БУДАЎНІЦТВА

Пасьпяховае выкананьне Саюзам ССР пяцігадовага пляну разьвіцьця індустрыялізацыі Саюзу ССР і перавыкананьню заданьня на першыя два гады пяцігодкі, савецкая ўлада значна ўзмацніла ў параўнаньні з 1930 г. дапамогу калгасам:

1) накіроўвае ў сельскую гаспадарку 120.000 трактараў (у пераводзе на 10-сільны трактар);

2) арганізуе 1.040 новых машына-трактарных станцый (апрача існуючых);

3) падвойвае забесьпячэньне сельскае гаспадаркі і калгасаў сельска-гаспадарчымі машынамі (на суму 768 млн. руб. замест 400 млн. руб. у мінулым годзе), у прыватнасьці ўпярэдзе накіроўваецца ў сельскую гаспадарку 7.000 грузавых і лёгкіх аўтамабіляў;

4) адпускае сельскай гаспадарцы 24 млн. цэнтнераў (145 млн. пудоў) угнаньняў і на 40 млн. руб. сродкаў барацьбы са шкоднікамі;

5) адпускае калгасам 21 млн. цэнтнераў (126 млн. пуд.) палепшанага і гатунковага насеньня;

6) адпускае калгасам і машына-трактарным станцыям 1 млрд. 50 млн. руб. па бюджэце і доўгатэрміновым крэдыце і, апрача таго, 350 млн. руб. у парадку аванса пасеўшчыкам, якія кантрактуюць прадукцыю свайго паляводзтва.

III.
КАЛГАСЫ ЦІ АДНААСОБНАЯ ГАСПАДАРКА

Пераможны калгасны рух рашуча зьмяняе суадносіны класавых сіл у Саюзе ССР.

1. На аснове разгортваньня суцэльнай калектывізацыі савецкая ўлада перайшла да ліквідацыі кулацтва як класы і пасьпяхова ажыцьцяўляе гэту палітыку на працягу апошняга году. Серадняк, які ўступіў у калгас, пабач з калгасьнікам — ранейшым батракам і бедняком — ператвараецца ў сапраўдную і моцную апору савецкай улады ў вёсцы.

Тым самым у вялізарнай меры ўмацоўваецца змычка рабочай клясы з сялянствам, пашыраецца фундамант рабоча-сялянскай улады, для якой адгэтуль асноўнай і галоўнай апорай у вёсцы зьяўляецца калгасное сялянства.

Цалкам апраўдваюцца словы Леніна:

«Толькі ў тым выпадку, калі ўдасца на справе паказаць сялянам перавагі грамадзкай, калектыўнай таварыскай, арцельнай апрацоўкі зямлі, толькі калі ўдасца дапамагчы селяніну пры дапамозе таварыскай арцельнай гаспадаркі, тады толькі рабочая кляса, якая трымае ў сваіх руках дзяржаўную ўладу, сапраўды давядзе селяніну сваю правату, сапраўды прыцягне на свой бок моцна і надзейным чынам многамільённую сялянскую масу». (Ленін).

2. Цяпер, калі многамільённыя масы беднякоў і сераднякоў, пераканаўшыся ў перавагах калгасаў, уступілі на калгасны шлях, а кулацтва, — асноўны вораг калгасаў — ліквідуецца як кляса — перад кожным бедняком і серадняком-аднаасобнікам, ягчэ няўступіўшым у калгас, паўстала асноўнае пытаньне — за, ці супроць калгасу.

Бядняк і серадняк — аднаасобнік, які дапамагае кулаку змагацца в калгасамі і падрывае калгасное будаўніцтва, ня можа быць названы саюзьнікам і тым больш апорай рабочай клясы, — ён на справе саюзьнік кулака.

Толькі той бядняк і серадняк — аднаасобнік застаецца саюзьнікам рабочай клясы, хто разам з рабочай клясай дапамагае будаваць калгасы, хто падтрымлівае калгасны рух, хто дапамагае весьці рашучую барацьбу з кулаком.

Для таго, каб арабіцца сапраўднай і моцнай апорай савецкай улады, перад бедняком і серадняком — аднаасобнікам адзін шлях — шлях дапамогі калгасам, а пасьля і ўступленьня ў калгас.

Зьезд саветаў перакананы, што масавы вопыт калгасаў у найкарацейшы тэрмін пераканае беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў у выгадзе пераходу ў калгасы, і яны ўступяць пад калгасны сьцяг.

VI зьезд саветаў Саюзу ССР абавязвае работнікаў калгаснага руху і ўсе арганізацыі савецкай улады цярпліва і настойліва весьці растлумачальную работу сярод аднаасобнікаў, накіраваную да таго, каб пераканаць масы сялян стаць на шлях калектывізацыі.

Ход калектывізацыі на працягу апошніх тыдняў (за студзень, люты і першую дэкаду сакавіка ў калгасы ўступіла 2,8 млн. сялянскіх гаспадарак) паказвае, што новыя мільёны сялянскіх гаспадарак ужо вырашылі пытаньне аб тым, з кім ім ісьці — з рабочай клясай і ўсім калгасным сялянствам — за калгасы, ці з кулаком — супроць калгасаў.

IV.
ГАЛОЎНЕЙШЫЯ НЕДАХОПЫ Ў ПРАЦЫ КАЛГАСАЎ

Мільёны сялянскіх гаспадарак, уступіўшых у калгасы ў 1930 г., змаглі ўжо ў першую калгасную сяўбу ўвесну 1930 г. на многа павысіць у параўнаньні з аднаасобнай гаспадаркай, прадукцыйнасьць працы і скарыстаньне машын і прылад. Аднак, тыя магчымасьці павышэньня прадукцыйнасьці працы пры адначасовым яе палягчэньні, якія закладзены ў буйной калектыўнай гаспадарцы, былі скарыстаны далёка ня поўнасьцю дзякуючы раду сур'ёзных недахопаў у рабоце калгасаў.

Самымі галоўнымі і самымі шкодлівымі недахопамі ў рабоце калгасаў у 1930 годзе былі, па-першае, разм-

Сьледуйце прыкладу Вендарскага сельсавету

Праверым падрыхтоўку да сяўбы шырокай арганізацыяй пробных выездаў

Спатканьне 4-х сумежных калгасаў Вендарскага сельсавету ў часе пробнага выезду

НОВЫ ПРЫЛІЎ У КАЛГАСЫ

ВЫКЛІКАЎ ПРОБНЫ ВЫЕЗД

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.).

ВЕНДАРСКІ СЕЛЬСАВЕТ ДАВІЎСЯ ВЯЛІЗАРНЫХ ПОСЬПЕХАЎ У ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ВАЛЬШАВІЦКАЙ СЯЎБЫ І Ў РАЗГОРТВАНЬНІ СТАЛІНСКАГА ПРЫЗЫВУ Ў КАЛГАСЫ. АСАБЛІВАЯ ЎВАГА БЫЛА АДДАНА РАБОЦЕ СЯРОД БЕДНАТЫ.

САПРАЎДЫ ПЫРОКА ПАСТАЎЛЕНАЯ МАСАВАЯ РАБОТА, МАБІЛІЗАЦЫЯ КАЛГАСЬНІКАЎ І АДНААСОБНІКАЎ — БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ НА БАРАЦЬБУ З КУЛАЦТВАМ ДАЛА ТАКІЯ ВЫНІКІ.

ЗАМЕСТ АДНАГО КАЛГАСУ, ЯКІ ІСНАВАЎ УВОСЕНІ 1930 ГОДУ, ЗАРАЗ ІСНУЕ ЎЖО 14 КАЛЕКТЫВАЎ. РАБОТА ПА КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ БЫЛА ЎВЯЗАНА З АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕМ ВЫТВОРЧЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ ДА НА БАРАЦЬБУ ЗА КАЛГАС. НАСТАЎНІЦТВА БЫЛО ШЫРОКА ЎЦЯГНУТА Ў ЗМАГАНЬНЕ ЗА РАЗГОРТВАНЬНЕ СТАЛІНСКАГА ПРЫЗЫВУ Ў КАЛГАСЫ. АСАБЛІВАЯ ЎВАГА БЫЛА АДДАНА РАБОЦЕ СЯРОД БЕДНАТЫ.

САПРАЎДЫ ПЫРОКА ПАСТАЎЛЕНАЯ МАСАВАЯ РАБОТА, МАБІЛІЗАЦЫЯ КАЛГАСЬНІКАЎ І АДНААСОБНІКАЎ — БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ НА БАРАЦЬБУ З КУЛАЦТВАМ ДАЛА ТАКІЯ ВЫНІКІ.

ЗАМЕСТ АДНАГО КАЛГАСУ, ЯКІ ІСНАВАЎ УВОСЕНІ 1930 ГОДУ, ЗАРАЗ ІСНУЕ ЎЖО 14 КАЛ

СПАЖЫВЕЦКАЯ КААПЭРАЦЫЯ БССР
ЗРЫВАЕ МАБІЛІЗАЦЫЮ СРОДКАЎ

Плян паянакапленьня выканан менш, чым на палову.—Затаварваньне, слабы збор плацяжоў, шкодніцкія адносіны да завозу тавараў прыводзяць да перавышэньня лімітаў, да парушэньня фінансавай дысцыпліны

ЗА БОРТ КААПЭРАЦЫІ—ШКОДНІКАЎ І АПАРТУНІСТАЎ! ФІНАНСАВЫЯ РЭПРЭСІІ Ў АДНОСІНАХ СПАЖЫВЕЦКІХ ТАВАРЫСТВАЎ, ЯКІЯ НЯ ВЫКОНВАЮЦЬ ВАЖНЕЙШЫХ ЗАДАНЬНЯЎ!

РАШУЧАЙ БАРАЦЬБОЙ ЗА ФІНАНСАВЫ ПЛЯН ЗАБЯСЬПЕЧЫМ ПОСЬПЕХ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ БУДОЎЛІ!

Прымусіць спажывецкую каапэрацыю выканаць фінплян

Сьнежаньскі пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) даў выразную дырэктыву: «СПАЖЫВЕЦКАЯ КААПЭРАЦЫЯ ПАВІННА ЗЬВЯРНУЦЬ АСАБЛІВУЮ ЎВАГУ НА ЎЗМАЦНЕНЬНЕ РАБОТЫ ПА ПАЯНАКАПЛЕНЬНІ, УЗМАЦНЕНЬНЕ КРЭДЫТНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ, АПІРАЮЧЫСЯ НА АКТЫЎНУЮ ДАПАМОГУ ПЕРАДАВЫХ ЧЛЕНАЎ КААПЭРАЦЫІ».

Спажывецкая каапэрацыя БССР ня выканала дырэктыў пленуму, ня справілася з задачамі мабілізацыі сродкаў.

На 10-га сакавіка сабрана па спажывецкіх таварыствах 37 проц. квартальнага пляну паянакапленьняў. Плян па ўкладах і авансах выкананы на 61,2 проц.

Сарвана заданьне па зборы авансаў пад тавары.

Характарыстыка работы спажывецкай каапэрацыі, даная сьнежаньскім пленумам — «важнейшымі недахопамі спажывецкай каапэрацыі зьяўляюцца наяўнасьць нэпманскага духу, элемэнтаў самацёку, бюракратызму, апартунізму на практыцы, што прыводзіць да затаварваньня, ва ўмовах дэфіцытнасьці тавараў, засьмечанасьці апарату чужымі і шкоднымі элемэнтамі» — ня страціла сваёй вострасьці дагэтуль і можа быць: адносна да работы спажывецкай каапэрацыі БССР.

Залежы тавараў у крамах і на складах не зьмяншаюцца, залежы тавараў на вёсцы перавышаюць пляновыя астачы на 5 з паловай мільёнаў руб. Плян таваразвароту выкананы за першую дэкаду сакавіка толькі на 22 проц. месячнага заданьня. Заметкі, якія сёньня зьмешчаны ў «Зьвязьдзе», паведамляюць аб фактах затаварваньня ў радзе раёнаў, маюць мэсца наплявацельскія, чыста шкодніцкія адносіны да патрэбнага асартымэнту, да патраб раёнаў.

Старшыня Цэнтрасаюзу тав. ЗЯЛЕНСКІ на Ўсерасійскім зьезьдзе саветаў прывёў прыклады пасылкі на вёску шоўкавых панчох, а на песазагатоўкі — намордніка.

Заметкі, якія мы сёньня друкуем, аб прымусовым асартымэнце пудры пры продажы гарэлкі (Горкі), аб гадовых запасах запалак (Брагіна) таксама сьведчаць аб шкодніцтве ў галіне завозу тавараў. Сыстэма абязьлічваньня тавараў, спыненьня заказаў дае шырокае поле дзейнасьці для шкоднікаў. Адсутнасьць гаспадарчага разрахунку ў крамах, калі прыказчык ня ведае як працуе крама — з прыбыткам ці са стратамі —не стымулюе зацікаўленасьць работнікаў у мабілізацыі сродкаў.

Плян каапэраваньня насельніцтва фактычна сарваны.

Невыкананьне фінпляну, незацікаўленасьць у павышэньні тавараазвароту прыводзіць да парушэньняў крэдытнай дысцыпліны, да перавышэньня лімітаў, да агіднага становішча рахункаў. СПАЖЫВЕЦКАЯ КААПЭРАЦЫЯ ПЕРАВЫСІЛА ЛІМІТЫ КРЭДЫТАЎ НА 8 МЛН. РУБ.

Вялікую ролю адыграла тут мяккацэласьць раённых банкаў, якія не даволі настойліва дабіваліся захаваньня фінансавай дысцыпліны.

Якія прычыны адставаньня сыстэмы спажывецкай каапэрацыі БССР?

Каапэрацыя не мабілізавала лепшых бальшавіцкіх сіл, каб ВЫГНАЦЬ АПАРТУНІСТЫЧНЫЯ ЭЛЕМЭНТЫ, КАБ З КАРЭНЬНЯМІ ВЫРВАЦЬ ШКОДНІЦТВА З АПАРАТУ, КАБ АЬСВЯЖЫЦЬ ЯГО ПРАЛЕТАРСКІМІ КАДРАМІ.

Артыкул у «Зьвязьдзе» аб шкодніцтве ў органах забесьпячэньня каапэрацыі БССР даў малюнак засьмечанасьці каапэрацыйных арганізацый шкодніцкімі элемэнтамі, работа якіх дае сябе адчуваць і дагэтуль. Дзе-ні-дзе яна бязумоўна працягваецца і зараз.

Баявая задача — УЖЫЦЬ РАШУЧЫЯ ФІНАНСАВЫЯ РЭПРЭСІІ ДА СПАЖЫВЕЦКІХ ТАВАРЫСТВАЎ, ЯКІЯ ЗРЫВАЮЦЬ ФІНПЛЯН, якія парушаюць ліміты, фінансавую дысцыпліну, скараціць крэдыты, нават закрыць часова рахункі і гэтым прымусіць іх выканаць заданьні па мабілізацыі сродкаў. Трэба прыняць меры ў адносінах да Белкаапсаюзу, які ня кіруе работай па выкананьні фінпляну.

«Выкананьне вялікіх задач, пастаўленых народна-гаспадарчым плянам на бягучы год не магчыма бяз суровага ажыцьцяўленьня фінансавага пляну».

Гэту пастанову пленуму ЦК УсеКП(б) трэба памятаць заўсёды, кожную гадзіну, а ня толькі тады, калі дзяржбанк закрывае рахунак.

Нарада пры НКФ з удзелам упаўнаважанага ЦК УсеКП(б) тав. Ліўшыца вызначыла рад фінансавых сэкцый у адносінах да спажывецкай каапэрацыі.

І апошняе... Адносіны Белкаапсаюзу да мабілізацыі сродкаў найлепш характарызуе такі факт: на нараду пры НКФ прыслалі работніка, які абсалютна нічога ня ведаў аб выкананьні фінпляну спажывецкай каапэрацыяй, ня мог адказаць, як сьпед, ні на адно пытаньне, мог бліснуць толькі ненаўкімі лічбамі, вядомымі ўсім і кожнаму. З ТАКІМІ АДНОСІНАМІ ТРЭБА ПАКОНЧЫЦЬ.

ЗВОДКА
мабілізацыі сродкаў на 10-III

НАЗВА ПЛАЦЯЖОЎ	Проц. выкананьня квартальнага пляну.
Простыя пайткі	74,6
Пазыка «Пяцігодка»	44,1
Уклады ў ашчадкасу	55,1
Зварот сельска-гаспадарчых пазык	64,6
Акцыі Трактарацэнтру	11,4
Паявыя ўзносы ў ЦРК	84,3
Паявыя ўзносы ў спажыўтаварыства	37,2
Уклады і авансы ў спажыўтаварыства	61,2
Прамысловая каапэрацыя	57,4
Культабор у горадзе	47,7
Культабор у вёсцы	88,8
Жыльлёвая каапэрацыя	52
Сельска-гаспадарчая каапэрацыя (ільнаплядоўчая, малочна-жывёлагадоўчая і садова-гародняя) і г. д.	5,7
УСЯГО	52,1

Да 10-га сакавіка па БССР паступіла 21.214 тысяч рублёў з 40.773 тыс. руб. квартальнага пляну.

Залежы тавараў на складах каапэрацыі

ЧЫРВОНАЯ СЛАВАДА. (Наш кар.) Інакш, як злосным парушэньнем дырэктыў аб мабілізацыі сродкаў, нельга назваць тыя, парадкі, якія пануюць у спажывецкім таварыстве Чырвона-Слабодзкага раёну. Таварныя ліміты сыстэматычна парушаюцца — яны больш пляновых у 2-3 разы. Абсьледаваньне складаў спажывецкага таварыства выявіла рад апідных фактаў, якія сьведчаць аб няўменьні каапэрацыйнай арганізацыі матэрываць таварнымі лішкамі, аб безгаспадарчасьці і парушэньні крэдытнай дысцыпліны.

У той час, калі ў мястэчку адчувалася патрэба ў мужчынскіх шкарпэтках, іх ляжала на базе таварыства да суму каля 5 тыс. руб.

А як назваць такі факт, калі ў крамах ляжыць каламазі на суму 4 тыс. руб.? На базе можна знайсьці на вялікія сумы і такіх тавараў, як гардзіны, карункі, трыкатажная дзіцячая вопратка, выцяжкі, якія не прадаюцца на працягу месяца і больш. Доўгі час ляжалі дзіцячыя ватныя куртачкі, якія павінны былі быць разьмеркаваны паміж вучнямі школ, але, у зьвязку з іх малым разьмерам, зусім не разыходзіліся.

На базе можна знайсьці на суму да тысячы рублёў шоўкавых жаночых падвязак, якія ляжаць бяз руху доўгі час.

Спажывецкае таварыства ганебна адстае ў выкананьні пляну паянакапленьня і збору мэтавых укладаў.

Чырвона-Слабодзкая РКК-РСІ куды перададзены матэрыялы аб безгаспадарчасьці ў спажывецкім таварыстве, павінна рашуча рэагаваць на становішча ў раённай каапэрацыі.

П.

На чорную дошку

Наступныя раёны зрываюць выкананьне квартальнага пляну мабілізацыі сродкаў насельніцтва:

АЗАРЫЦКІ раён да 10-га сакавіка сабраў 33,8 проц. квартальнага пляну, ДРЫСЕНСКІ — 33 проц., ПРАПОЙСКІ — 34,8 процантаў, РАСЬНЯНСКІ — 35,8 проц., РАСОНСКІ — 35,6 проц., СТАРОБІНСКІ — 33,9 проц., СЕНЬНЕНСКІ—33,2 проц., КАПАТКЕВІЦКІ — 33,8 проц.

Транспартная зводка

Зьняць кіраўніцтва
МАГІЛЕЎСКАГА МЯСЦКОМУ ЦЯГІ

АПАРТУНІСТЫ З МК ХАВАЮЦЬ СВАЮ НЕПРАЦАЗДОЛЬНАСЬЦЬ ЗА ШЫРМАЙ „АБ'ЕКТЫЎНЫХ" ПРЫЧЫН

У ЖЛОБІНЕ ВЫКРЫТА ГРУПА ШКОДНІКАЎ

Бязьлітаснай барацьбой супроць правых апартуністаў і шкоднікаў даб'ёмся аздараўленьня транспарту

Правыя апартуністы МК цягі

супроць аздараўленьня паравознай гаспадаркі

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Рабочыя Магілеўскага чыгуначнага вузла заключылі сацдагавор са Жлобінскімі раёнам на выкананьне вымяральнікаў трансфінпляну.

Абвешчаны штурм аздараўленьня паравознай гаспадаркі.

Прафсаюзныя арганізацыі вузла ня сталі на чале абвешчанага штурму, а па-апартуністычнаму перашкаджаюць яго разгортваньню. Члены МК цягі ШУЛЬКОЎСКІ і СЬПІРЫН на пасяджэньні МК імкнуліся вытлумачыць дрэннае становішча паравозаў «аб'ектыўнымі» прычынамі, «даказваючы», што здаровай паравознай гаспадаркі дабіцца зараз нельга.

Апартуністычныя выступленьні памянёных членаў МК сустрэлі рашучы адпор з боку прысутных рабочых і рэшткі членаў мясцкому Шулькоўскі і Сьпірын атрымалі вымову.

АД РЭДАКЦЫІ: Спасыланьне на «аб'ектыўныя» прычыны, нявер'е ў магчымасьць аздараўленьня паравознай гаспадаркі з боку пасобных членаў МК цягі па сутнасьці зьяўляюцца яркавыразьнымі правапартуністычнымі настроямі.

Зусім відавочна, што гэтыя члены МК ня здольны быць на чале энтузіязму рабочых і таму ня могуць застацца ў складзе МК.

Выкрыта група шкоднікаў

Рабочыя адказалі на шкодніцтва абвяшчэньнем штурму па аздараўленьні паравознай гаспадаркі

ЖЛОБІН (Наш кар.). Органамі АДПУ выкрыта група шкоднікаў, якая на працягу доўгага часу сыстэматычна падрывала цягніковую гаспадарку на вузле.

Гэтая група ў складзе: Малюшыцкіх Уладзімера і Рыгора і Гурскага на чале з Шацыла забілі 20 дымагарных труб у паравозе, паўмысьля, каб сапсаваць, кінулі шрубу ў цылядр паравозу, які рамантаваўся камсамольскай брыгадай, рабілі пакражы, закідвалі падшыпнікі з мэтай вывядзеньня са строю паравозаў, пісалі анонімкі з пагрозай спусканьць паравозы пад адкос і г. д.

У адказ на шкодніцкую дзейнасьць агентаў клясавага ворага ўзьнімаецца хваля творчага ўздыму сярод рабочых вузла. Абвешчан месячнік штурму па аздараўленьні паравознага парку і ўзьняцьці працоўнай дысцыпліны.

Чыгуначныя арганізацыі павінны стаць на чале гэтага ўздыму, шырэй разгортваць спаборніцтва і ўдарніцтва, узмацняць пільнасьць рабочых да вылазак клясавага ворага.

Машыніст.

ЖЛОБІН (Наш кар.). Габочыя дэпо ў адказ на выкрытае шкодніцтва абвясьцілі сябе ўдарнікамі і абавязаліся ліквідаваць прарывы ў выкананьні трансфінпляну, узмацніць працоўную дысцыпліну, дабіцца поўнага аздараўленьня паравознага парку.

Агульны сход патрабуе ад судовых органаў самай суровай кары для шкоднікаў, якія падрывалі транспартную гаспадарку.

На ўсіх мясцкомах, ст. Жлобін адбыліся агульныя сходы рабочых. Рабочыя ў сваіх рэзалюцыях патрабуюць выняцьці ўсіх выхадны дзень на ліквідацыю прарываў і заробленыя грошы аддаць у фонд абароны краіны.

Вучні школы ФЗВ таксама пастанавілі працаваць выхадны дзень, 30 лепшых вучняў надалі заявы ў камсамол.

Машыніст.

Грубае парушэньне спаранай

ВОРША. (Наш кар.). Па загаду дырэкцыі Аршанскі вузел дапамагае віцебскаму сваімі паравозамі, бо апошні не спраўляецца з работай па выдачы паравозаў пад цягнікі з прычыны чаго часта адмяняецца адпраўленьне.

11-га сакавіка таварны цягнік з Ворпы ў Віцебск прывёз на Аршанскім паравозе сорыя ПЦ прымацаваны да яго машыніст **Воўкаў**. Паводле правіл тав. **Воўкаў** паставіў паравоз у дэпо, замкнуў яго і акрамя яго ніхто ня меў права ехаць на ім. Мін тым, дзяжурны на дэпо, бяз ведама машыніста Воўкава, зламаў ночку замкі і адправіў сваю брыгаду на гэтым паравозе ў Магілеў.

У выніку грубага парушэньня правіл спаранай язды машыніст **Воўкаў зьвярнуўся** з Віцебску пасажырам, а інструмант з яго паравозу аказаўся раскрадзеным.

Я. П.

АД РЭДАКЦЫІ: Заметка «Грубае парушэньне спаранай» па тэхнічных прычынах не ўвайшла ў падборку аб транспарце ў № 76 «Зьвязды».

Суботнікі праходзяць самацёкам

Першыя дні правядзеньня суботнікаў прымушаюць біць трывогу. Некаторыя партыйныя, прафсаюзныя і камсамольскія арганізацыі на сталі на чале творчага энтузіязму мас, не пашырылі гэты добраахвотны рух за дапамогу транспарту, не ўвялялі яго на адпаведную палітычную вышыню.

Завод «**Камунар**» з 5-га па 15-га сакавіка паслаў для дапамогі ў рамонце ўсяго 4 сьлесараў, а завод «**Энергія**»—Ж Гэта пры мінімальнай штодзённай патрэбе вузла ў 20-25 сьлесарах і токарах. Характэрна, што па вестках ЦП саюзу мэталістаў, завод «**Энергія**» штодзённа накіроўвае 8 кваліфікаваных рабочых, а завод «**Камунар**»—92 сьлесараў і 11 токараў, якія працавалі на працягу 2-х тыдняў. Цяжка сказаць, чые весткі будуць больш праўдаподобнымі.

Белбюро ЦК чыгуначнікаў, на якое ЦСПСБ усклаў адказнасьць за суботнікі, **ніяк ня можа наладзіць уліку правядзеньня іх па вузлох Беларусі.**

Паводле даных штабу на правядзеньні суботніка, **за 10 дзён на Менскім вузле прынялі ўдзел у суботніку каля 7 тысяч працоўных.** Аднак, ніхто ня ведае, які эфэкт далі гэтыя суботнікі.

Адміністрацыя чыгункі вялімі дрэнна падрыхтавалася да правядзеньня суботніка. Ёсьць выпадкі, калі прыйшоўшы на суботнік застаюцца па некалькі гадзін без работы, або зусім варочаюцца да хаты. **15-га сакавіка 600 чалавек былі адпраўлены да хаты, а каля 400 чалавек на працягу 2-3 гадзін хадзілі па шляхох у пошуках работы.**

ЧЫГУНАЧНІК.

Вынікі шкодніцтва і апартуністычнага прымірэнцтва

Сыстэма спажывецкай каапэрацыі БССР ганебна зрывае выкананьне фінпляну першага кварталу 1931 году па ўсіх галінах.

Зусім ня выканана заданьне па паянакапленьні. Плян збору паёў на вёсцы выкананы на 10-га сакавіка на 37,2 проц.

Тэмпы збору паёў ня толькі не нарастаюць, але каждаварот зьніжаюцца. Першая дэкада ўдарнага месячніка дала рэзкае зьмяншэньне збору паёў. Калі ў лютым у сярэднім за дэкаду паступала 280 тысяч рублёў, дык першая дэкада сакавіка дала толькі 210 тысяч.

Яшчэ горш стаіць справа са **зборам авансаў на прамтавары.** Заданьне—на працягу лютага і сакавіка сабраць аванса ў суму 3.450 тысяч рублёў—ня выканана ўсёй сыстэмай.

Шкоднікі з Белкаапсаюзу—Архангельскі, Гарміэ і інш.—усялякі спосабамі тармазілі давядзеньне гэтага заданьня, як і іншых, да пізавых зьвеньняў каапэрацыі; толькі ў пачатку лютага яно было афармлена і даведзена да раёнаў.

І запраўды, ці хто чуў аб зборы авансаў на прамтавары ў першым квартале? Ці даны калектывам і кашкамісіям заданьні па зборы авансаў? (хаця-б у Менску).

Заданьне было сарвана!

З месяца ў месяц ня выконваецца **плян таваразвароту.**

У студзені выкананы 91%, у лютым —83. Першая дэкада сакавіка дала 22 проц. месячнага пляну і зьніжэньне ў абсалютных лічбах, у параўнаньні з апошняй дэкадай лютага, на 2 міл. рублёў.

Паводле дырэктыў, астача тавараў за 1-е сакавіка павінна быць зьніжана да 16.700 тысяч рублёў. Ёсьць запасы тавараў на 25.226 тысяч рублёў. Астача тавараў па вёсцы перавышае намечаныя ліміты на 5 з паловай мільёнаў рублёў.

Прарывы ў таваразвароце выкліканы непаваротлівасьцю сыстэмы, няўменьнем манэўраваць таварнымі фондамі, старой прывычкай трымаць тавары па складах, нядольнасьцю ажыцьцяўляць клясавы прынцып разьмеркаваньня.

Вось некалькі прыкладаў «умслага» манэўраваньня з боку Белкаапсаюзу.

У **Барысаве** на складах накапіўся 5-цімесячны запас павідла. Белкаапсаюз пасылае дадаткова павідла на 17 тысяч руб. Там-жа ёсьць запас махоркі на паўгода.

У **Брагіне** ёсьць запас запалак амаль што на год. Аб гэтым райспажывецкае таварыства паведаміла Белкаапсаюзу, але апошні пасылае ў Брагін яшчэ 45 тысяч скрынак запалак.

У мястэчку ёсьць такі вялікі запас махоркі, што яна выдаецца кожнаму бяз нормы і без наборных кніжак. Туды-ж Белкаапсаюз пасылае значную партыю сімовых шапак коштам ў 18 руб лёў кожная, дарагія жаночыя сумкі і г. д.

У **Горацкім раён** паслана вялікая партыя пудры. У сувязі з гэтым, мясцовыя каапэратары дадумаліся да арыгінальнага прымусовага асартымэнту. Усе тыя, хто пакупаюць гарэлку, павінны ў якасьці асартымэнту набыць 5 каробак пудры на кожны літр.

Менскі ЦРК на працягу студзеня-лютага не забірае ад броварў 30 тысяч літраў дэнатурату, між тым спажыўцы рабочыя і служачыя адчуваюць вялікую патрэбу ў дэнатураце і штодзённа заглядваюць у крамы, каб даведацца ці прывезьлі яго.

Адпаведныя органы павінны зацікавіцца, ці ня дзейнічае і тут знаймая нам рука шкодніка—агента інтэрвэнтаў?

Усе гэтыя прарывы зьяўляюцца вынікам **праваапартуністычнай недаацэнкі мабілізацыі сродкаў, непаваротлівасьці і нягібкасьці сыстэмы, вынікам шкодніцкай работы** ў пасобных аддзелах і зьвеньнях Белкаапсаюзу.

Рабочая грамадзкасьць павінна дапамагчы спажывецкай каапэрацыі ліквідаваць прарывы ў мабілізацыі сродкаў.

С-ў.

Ідуць наперадзе

Паводле даных НКФ на 10-га сакавіка, найлепшымі раёнамі, якія ідуць наперадзе па мабілізацыі сродкаў, зьяўляюцца: АРШАНСКІ, мабілізаваўшы 61,6 проц. квартальнага пляну, БЯРЭЗІНСКІ — 66,5проц., КЛІЧАЎСКІ — 62,2 проц., КАРАЛІНСКІ — 67,9 проц., РЭЧЫЦКІ — 60,7 проц., МАГІЛЕЎСКІ — 61,2 проц.

Аднак, работу гэтых раёнаў нельга лічыць зусім здавальняючай. Пры тых тэмпах мабілізацыі сродкаў, якія былі разгорнуты ў студзені і лютым г. г., нельга дасягнуць асноўнай задачы — поўнасьцю выканаць плян да 1-га красавіка. Раёны павінны падцягнуцца.

Прафсаюзы на барацьбу за фінплян

УсеЦСПС ПАСЛАЎ ЗА ПОДПІСА М ТАВ. ШВЭРНІКА НАСТУПНУЮ ТЭЛЕГРАМУ УСІМ СТАРШЫНЯМ САВЕТАЎ ПРАФСЫЯНАЛЬНЫХ САЮЗАЎ І ЦК САЮЗАЎ:

«МАБІЛІЗАЦЫЯ СРОДКАЎ НАСЕЛЬНІЦТВА — ВАЖНЕЙШАЯ ПРАДПАСЫЛКА ВЫКАНАНЬНЯ НАРОДНА-ГАСПАДАРЧАГА ПЛЯНУ ТРЭЦЯГА РАШАЮЧАГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ. АПОШНЯЯ ДЭКАДА ЛЮТАГА НЕ ДАЛА ЗРУХУ. ПЛЯН ПЕРШАГА КВАРТАЛУ ЗНАХОДЗІЦЦА ПАД ЯЎНАЙ ПАГРОЗАЙ ЗРЫВУ. ПРАПАНУЕМ НЕАДКЛАДНА РАЗГАРНУЦЬ САПРАЎДЫ БАЛЬШАВІЦКІЯ ТЭМПЫ МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ, ЯКІЯ ЗАБЯСЬПЕЧВАЮЦЬ 100 ПРОЦ. ВЫКАНАНЬНЕ КВАРТАЛЬНАГА ПЛЯНУ».

НАМЕСЬНІК НАРКАМФІНУ СССР ТАВ. ГЕНКІН ТЭЛЕГРАФАВАЎ УСІМ НАРКАМФІНАМ САЮЗНЫХ І АЎТАНОМНЫХ РЭСПУБЛІК І ЗАГАДЧЫКАМ АБЛАСНЫХ І КРАЯВЫХ ФІНАДДЗЕЛАЎ АБ РАСПАРАДЖЭНЬНІ ТАВ. ШВЭРНІКА І ПРАПАНАВАЎ НЕАДКЛАДНА ЗЬВЯЗАЦЦА З ПРАФСАЮЗНЫМІ АРГАНІЗАЦЫЯМІ Ў МЭТАХ БАЯВОГА ВЫКАНАНЬНЯ ДЫРЭКТЫВЫ УсеЦСПС.

Дом Чырвонай арміі — 22 сакавіка
Для нач. складу запасу і чырвоных партызан
АДБУДЗЕЦЦА ДАКЛАД:
„СЛУЖБА ЗАГАРАДЖЭНЬНЯЎ"
—) ПАЧАТАК У 19 ГАДЗ. (—
Уваход па вучотна-вайсковых білетах
Пасьля дакладу КІНО

ДОМ АСЬВЕТЫ. Сёньня, 21-га сакавіка 2 кіно-сеансы РУБІКОН. Пачатак у 8 і 10 гадз. веч.

Кіно-тэатр „Культура" ЁСЬЦЬ, КАПІТАНІ Звыш праг. ЗА УСЕНЯВУЧ у 1 ч. Пачатак: 7 г., 8 г. 45 м., і 10 г. 30 м. КАСА—з 5 гадз.

Гукавы кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" Новы фільм У СУЛЁТА.. Звыш праграмы гукавы кіно-канцэрт Пачат., 7 г. 8 г. 45 м. і 10 г.30 м. КАСА—з 5 гадз.

Кіно „Інтэрнацыянал" БЛАКІТНЫ ГЯСАК Звыш праграмы—Палітасьветфільм Змова інтэрвэнтаў Пачатак у 6 г. Каса з 4 з пал. гадз.

КІНО „Гаспадары" Мастацкі фільм У горад уваходзіць нельга Пачатак 1 га сэансу ў 6 гадз.

КІНО „Юны Піянэр" 1) МІТРОШКА САЛДАТ кіно-фільм у 3 частках 2) Поспехі на гарызонце Культурфільм у 3 частках. Пач. сэансу у 1 г. д. Каса—з 12 г. д

КІНО „Спартак" Ігар Ільінскі ў карціне Калі прабуджаюцца мёртвыя камедыя ў 7 частках Пач. у 7 г., 8 г. 45 м., 10 г. 30 м. Каса—з 5 гадз.

Кошт публікацыі аб згубе 1 р. 1 дакументу

Менскае Аддзяленьне Дзяржбанку
ФОНДАВЫ АДДЗЕЛ
ПРАПАНУЕ ўсім установам і прадпрыемствам гор. Менску, якія прыналежаць да Менскага Аддзяленьня Дзяржбанку,
У ТЭРМІНОВЫМ ПАРАДКУ
над асабістую адказнасьць кіраўнікоў устаноў і прадпрыемстваў
—) ЗЬЯВІЦЦА Ў ФОНДАВЫ АДДЗЕЛ З ДАРУЧЭНЬНЕМ ДЛЯ (—
АТРЫМАНЬНЯ ЗАМАЦАВАЛЬНЫХ ТАЛЁНАЎ
ПАЗЫКІ „ПЯЦІГОДКА—ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ"
Адначасова прапануецца ў тэрміновым парадку прадставіць сьпісы на атрыманьне замацавальных талёнаў прадпрыемствам, якія да гэтага часу не прадставілі гэтакіх фондаваму аддзелу.
У выпадку несвоечасовага забесьпячэньня ня ектыву замацавальнымі талёнамі, гэткія будуць пазбаўлены магчымасьці ўдзельнічаць у ПЕРШЫМ ТЫРАЖЫ —)(— ЯКІ АДБУДЗЕЦЦА 8-га КРАСАВІКА —)(—
Фондавы Адз. Мен. Аддз. Дзяржбанку.

Да ведамы грамадзян гор. Менску.
У МЭТАХ УПАРАДКАВАНЬНЯ ВУЛІЧНАГА РУХУ
астаноўкі вагонаў трамвая
на рагу Ленінскай і Савецкай
з 20-га сакавіка гэтага году ПЕРАНОСЯЦЦА:
пры сьледваньні вагонаў трамвайнай лініі №№ 1, 2 і 3 у бок таварнай і пасажырскай станцый з рогу Ленінскай і Савецкай
на рог Савецкай і Камсамольскай,
пры сьледваньні-ж вагонаў у бок Камароўкі і Пярэспы
на рог Савецкай і Энгельса вуліц.
Пасадкі і высадкі з вагонаў трамвая на рагу Ленінскай і Савецкай ЗАБАРАНЯЮЦЦА, нават у выпадках спыненьня вагонаў па тэхнічных прычынах.
Вінаватыя ў парушэньні будуць прыцягвацца да адміністрацыйнай адказнасьці.
Трамвайнае кіраўніцтва.

Менгарком КП(б)Б і Дом Чырвонай арміі
23 сакавіка ў 19 гадз. склікаюць
ЗЬЛЁТ ЖОНАК НАЧСКЛАДУ
Менскага гарнізону (у памяшканьні Дому Чырвонай арміі).
ПАРАДАК ДНЯ:
1. Сацыялістычнае будаўніцтва і ўдзел жонак начскладу.
2. Інфармацыя дэлег. тах Маскоўскай канфэрэнцыі.
Пасьля—мастацкая частка.
Сакратарам вайсковых пад'р'зд. прапануецца атрымаць білеты на зьлёт у Менгарконе КП(б)Б з 21-га сакавіка з 12 да 4 гадз. дня ў пакоі № 10.

23 сакавіка 1931 г. у 6 гадз. вечара, у НДІ Сан. Рэканструкцыі с.-г. імя Леніна адбудзецца
ПЛЕНУМ ІНСТЫТУТУ
сумесна з прадстаўнікамі зацікаўленых вытворчых устаноў.
Парадак дня:
«Прыродна-гістарычныя ўмовы раёнаў БССР» Даклады праф. Каргародава, праф. Вінэра, т. Пратасеня. Савіцкага і інш.
Дырэкцыя Інстытуту.

На аснове рэарганізацыі сеткі спажыўсыстэмы
Мсьціслаўскае РайПО ліквідуецца.
Усе ўстановы, якія маюць прэтэнзіі, павінны прад'явіць да 1 красавіка г. г. ліквідкому. Пасьля паказанага тэрміну ніякія прэтэнзіі разглядацца ня будуць.
Ліквідком.

АНГЕЛЬСКАЯ І НІМЕЦКАЯ МОВЫ
Бесьпл. запіс. ня прыём на ЗАОЧНЫЯ ДЗЯРЖКУРСЫ „ИН-ЯЗ" Москва
Кузнецкий мост 15 (пятнаццаць)
Паспэт высыл. за 20 коп. дробн. марк.

ІСПЫТЫ
ДЛЯ ПАСТУПАЮЧЫХ
на беларускія ДРАМАТЫЧНЫЯ КУРСЫ
прызначаюцца на 1 красавіка ў Дому Пісьменьніка. Прыём заяў да 30 сакавіка.

Патрэбен вопытны ст. бухгальтар
Аплата из згоды.
Адрас у культоры выд-ва «Зьвязды»

ПРАПАЛА
собака, сука, 10 мес., пароды бульдог, кушы і хвост абрэзаны. Прошу паведамець па адрасе: вул. Бэрсана 6. Трубная, № 6, кв. 1.
За ўтойваньне буду праследаваць.

МЕНСК
Горад будуецца

Менскі Камгас выпрацаваў плян будаўніцтва на 1931 год. Паводле пляну ў Менску будуць пабудаваны: **гасьцініца** па Бабруйскай вуліцы; **новыя дамы:** на 86 кватэр — па рагу вуліц Дзяржынскага і Рыгораўскай, на 34 кватэры — для рабочых Менпівэю, 34 кватэры — па вуліцы Крапоткіна; новы гаражскі тэатр; **трамвайны шлях** праз Кальварыйскую, Рэспубліканскую, Інтэрнацыянальную, Валадарскую, Савецкую і Сьвярдлоўскую вуліцы да чыгункі; новая **лазьня** па Нова-Маскоўскай, або па 2-й Сяргееўскай вуліцы; **цэнтральная пажарная часьць** па рагу вул. Энгельса і Кастрычніцкай; **дачы для рабочых** у Драздох, Замчышчы і Крыжоўцы; **калодзежы** па Загараднай, Рэчыцкай, Беларускай, Заслаўскай, Крапоткіна, Крылоўскай і Ізвозная вуліцах.

На Барысаўскім тракце, каля былой Усебеларускай с.-г. выстаўкі будзе арганізаваны **парк культуры і адпачынку**, там-жа вызначана адкрыць зоалёгічны і ботанічны сады. Праз двор Нарк[illegible] (Савецкая вул.) будзе пракладзена новая вуліца з выхадам на Інтэрнацыянальную і Камсамольскую вуліцы.

Вуліца К. Маркса (ад Сьвярдлоўскай да Дому Калгасьніка) будзе забрукавана **клінкерам. Савецкая вуліца** (ад вул. Луначарскага да Ленінскай) і Ленінская вул. (ад рогу Савецкай да пляцу Волі) будуць забрукаваны брушчаткай. Вуліцы 2-я Лекерта, Пралетарская, Набережная, Унівэрсытэцкая, Гарбарная, Першамайская і Калінаўскага і Вялёсны пэдны заб. будуць перапляніваны і забрукаваны.

Выпусьціць пазыку імя 3-га рашаючага

КАНФЭРЭНЦЫЯ ЎКЛАДЧЫКАЎ АШЧАДКАС Г. МЕНСКУ, ЯКАЯ АДБЫЛАСЯ 17 САКАВІКА І Ў ЯКОЙ ПРЫМАЛІ ЎДЗЕЛ ДЭЛЕГАТЫ ФАБРЫК, ЗАВОДАЎ, УСТАНОЎ І ВАЙСКОВЫХ ЧАСЬЦЕЙ ПАСТАНАВІЛА:

— УЛІЧВАЮЧЫ ВЯЛІЗАРНУЮ РОЛЮ ПАСКАРЭНЬНЯ ТЭМПАЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА І ЗАБЕСПЯЧЭНЬНЯ ФІНАНСАВАНЬНЯ НАРОДНА-ГАСПАДАРЧАГА ПЛЯНУ ТРЭЦЯГА РАШАЮЧАГА ГОДУ, У АДКАЗ ІНТЭРВЭНТАМ — ПАДПАЛЬШЧЫКАМ ВАЙНЫ, — ПРАСЬЦЬ УРАД СССР ВЫПУСЬЦІЦЬ НОВУЮ ПАЗЫКУ ІМЯ ТРЭЦЯГА РАШАЮЧАГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ.

Да пастаноўкі п'есы „Качагары" у БДТ2

Ва ўчаранішнім нумары «Зьвязды» была зьмешчана тутарка з дырэктарам БДТ2—тав. **Вольскім**—аб новых шляхох работы БДТ2.

У тутарцы ня была падкрэслена роля газэты «Рабочий» у рабоце над пастаноўкай п'есы «Качагары».

Калектывы супрацоўнікаў газ. «Рабочий» і БДТ2 заключылі паміж сабой сацдагавор. Калектыў «Рабочага» ўзяў на сябе абавязацельства прыцягнуць рабочых-брыгадзіраў да ўдзелу ў пастаноўцы п'есы «Качагары». П'еса была абгаворана на аб'яднаным сходзе супрацоўнікаў газ. «Рабочий» і рабкораў. На заводах «Камунар», «Варашылава», «Дрэваапрацоўшчык» і «Эльвод» газэты «Рабочий» арганізоўвае мастацкія брыгады рабочых.

Паведамленьні

— 21 сакавіка ў 7 гадз. вечара ЗБОР ГАРАДЗКІХ АВІЯХІМАТРАДАЎ. Гар. атрад у памяшк. 2-й школы друкароў—клюб друкароў.

Ф-ка «Кастрычнік» — пенкуток швэйнікаў.

Ф-ка «8-е сакавіка»—на фабрыцы.

Ф-ка імя Крупскай—клюб друкароў.

ГАРСАВЕТ АСОАВІЯХІМАТРАДУ.

— Рарыё-унівэсытэт. 22 сакавіка, у 19 гадз., у памяшк. Беларускага радыёцэнтру (Унівэрсытэцкая, 16, 2-гі паверх) адбудзецца нарада па пытаньні работы і далейшых перспэктыў Беларускага рабоча-калгаснага унівэрсытэту па радыё. На нараду павінны зьявіцца лектары, якія чыталі і чытаюць у 1930-31 навучальны годзе. Таксама запрашаюцца прадстаў